ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 43 (690) | Субота, 23 кастрычніка 1948 года. | Цана 50 кап.

Важнейшая ўмова развіцця літаратуры

За два гады пасля гістарычных пастаноў ЦК ВКП(б) па ідэалагічных пытаннях у творчасці пісьменнікаў Беларусі намеціўся значны паварот да тэм сучаснасці. Іменна за гэтыя гады ў нашай літаратуры заўважаецца найбольш шырокае імкненне паказаць індустрыялізацыю рэспублікі, паказаць новыя рысы характару совецкага чалавека, асэнсаваць шлях народа, пройдзены за сваё 30-годдзе пад слаўным сцягам партыі Леніна—Сталіна.

Шырокае эпічнае абагульненне важнейшых падзей у жыцці народа, зробленае Якубам Коласам у паэме «Рыбакова хата», ёсць, перш за ўсё, доказ развіцця лепшых традыцый нашай паэзіі — яе непарыўнай сувязі з жыццём, яе глыбокай рэалістычнасці і народнасці. Разам з гэтым новы твор Я. Коласа можа служыць і як сур'ёзны дакор большасці беларускіх паэтаў, якія ўсё яшчэ абмяжоўваюць свае творчыя магчымасці выключна лірыкай, робячы нашу паэзію жанрава аднастайнай. У нашай паэзіі ўжо доўгія часы не з'яўляецца ні аднаго буйнага эпічнага твора. На першы погляд можа здацца, што гэта чыста літаратурная з'ява, аднак гэта зусім не так. Жанравая аднастайнасць і тэматычная абмежаванасць нашай паэзіі тлумачацца, перш за ўсё, адрывам паэтаў ад сапраўднай крыніцы творчасці—ад сучаснага жыцця. І наадварот, як навочны факт нельга не адзначыць, што наша проза вырасла і актывізавалася якраз за апошнія гады іменна таму, што яе жыватворчай глебай стала само жыццё, тыя надзённыя праблемы і з'явы, якія хвалююць нашу грамадскасць. Маладыя празаікі сваімі першымі творамі выклікаюць большую ўвагу, зацікаўленасць і прызнанне чытача, чым многія творы ўжо сталых і вядомых паэтаў. Дарэмна было-б шукаць гэтаму апраўдання ў тым, што, бачыце, чытач больш любіць прозу, што чытач не разумее паэзіі і г. д. Чытач разумее і любіць творы сапраўднай паэзіі. Лепшыя ўзоры совецкай паэзіі сталі для яго жыццёва неабходнымі спадарожнікамі. І калі некаторыя новыя паэмы і вершы не выклікаюць жывога водгуку ў сэрцы чытача, дык гэта таму, што яны не закранаюць яго запаветных думак і пачуццяў. Многія паэты і, у тым ліку, нават маладыя паэты, сталі аднастайнымі па тэматыцы і па мастацкіх сродках і вобразах таму, што вучацца не ў жыцця, чэрпаюць свае настроі не ў народа, а бяруць іх напракат адзін у другога, у межах таго вузка-цэхавага, прафесійнага асяроддзя, якое служыць для іх законадаўцам літаратурных мод і гатовых паэтычных шаблонаў.

Соцыялістычны рэалізм — творчы метад совецкай літаратуры — патрабуе ад пісьменніка актыўнага ўтаржэння ў жыццё, у практыку нашага будаўніцтва. Нашы-ж паэты амаль не бываюць на новабудоўлях рэспублікі, на заводах і ў калгасах, зусім недастаткова ўзбагачаюць свае веды вучэннем марксізма-ленінізма, спадзеючыся выключна на сваю «творчую фантазію і інтуіцыю». Зразумела, што ў некаторых пісьменнікаў існуюць застарэлыя ўяўленні аб народзе, аб совецкіх людзях, аб іх жыцці і працы. Грунтуючыся на адсталых уяўленнях аб вёсцы, аб калгаснікох, А. Бялевіч у сваіх паэмах «Мой майстра», «Сям'я», «Аксанія» і інш. паэтызуе перажыткі дробнаўласніцкага светапогляду, традыцыі дзядоўска-патрыярхальнага побыту. Пэўны недахоп непасрэднага ўплыву сучаснага жыцця на творчасць такіх даволі сталых паэтаў, як М. Лужанін, М. Машара, А. Астрэйка, А. Бурдзель, А. Бачыла і інш. прыкметна абмяжоўвае іх паэтычныя магчымасці, іх выяўленчыя сродкі. Толькі яркасць і навізна матэрыялу, свежасць назіранняў і ўражанняў дыктуе і навізну формы, свежасць паэтычнага слова. Вось чаму даволі крыўдна і прыкра робіцца, калі паэт, беручы актуальную і адказную тэму, выказвае яе трафарэтнымі, бездапаможнымі сродкамі. Так, у новым зборніку А. Астрэйкі «Добры дзень» амаль усе вершы названы гучнымі сучаснымі загалоўкамі, а напісаны ў стылі 20—30-гадовай «паэтычнай» даўнасці.

Беларускім паэтам трэба мець мужнасць сказаць, што перабудова іх творчасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі нашага народа ідзе марудна, ідзе далёка нездавальняюча. Такое становішча не можа быць цярпіма асабліва зараз, калі беларускі народ з велізарным уздымам падводзіць вынікі сваёй гераічнай працы за слаўнае 30-годдзе, пройдзенае пад непераможным сцягам большэвікоў, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна.

За самазаспакоенасць нашай паэзіі, за адставанне яе ад жыцця нясуць адказнасць не толькі тыя паэты, творчасць якіх крытыкавала наша грамадскасць. У гэтым вінаваты і некаторыя нашы лепшыя майстры слова, якія самі заспакоіліся на дасягнутым і прызвычаіліся да думкі, што ўсё, што выходзіць з-пад іх пяра, павінна безагаворачна прымацца чытачамі і крытыкай.

Цэнтрам літаратурна-грамадскай думкі, цэнтрам, рухаючым, будзячым жывую творчую дыскусію павінна была-б стаць камісія па крытыцы (кіраўнік А. Кучар), аднак існуе яна ў Саюзе пісьменнікаў толькі на паперы. І гэта ў той час, калі наша грамадскасць, рыхтуючыся да 30-годдзя Беларускай ССР, хоча ведаць і аб дасягненнях беларускай совецкай літаратуры, і аб яе важнейшых праблемах, і аб яе недахопах.

Крытыкі не асмельваюцца сказаць самае простае ісціны, якую ведае кожны чытач, што недастатковае веданне жыцця, павярхоўнае азнаямленне з матэрыялам былі прычынамі з'яўлення слабых, няпоўнацэнных твораў у некаторых вядучых пісьменнікаў. Такім чынам, усё з-за тых-жа групавых, прыяцельскіх меркаванняў, усё з-за той-жа боязні, аб якой гаварыў А. А. Жданаў, нашы крытыкі праходзяць міма сур'ёзных недахопаў у нашых творах.

Набліжаецца 30-годдзе рэспублікі. Разам з усімі работнікамі культуры пісьменнікі Беларусі трымаюць сур'ёзны экзамен перад сваім народам. Трэба, каб гэты экзамен вытрымаў кожны баец нашага ідэалагічнага фронта. Трэба, каб кожны літаратар прапікся вялікай адказнасцю перад сваім народам і ўжо сёння спытаў сам сябе, якімі дасягненнямі свае дзейнасці сустракае ён вялікае свята.

Ці не пара ўжо адкінуць бухгалтарскія балансы і гаварыць аб рэальных выніках зробленага? Ці не пара ўжо ад урачыста-ўзвышанага стылю ў размовах аб дасягненнях перайсці да канкрэтнага, па-большэвіцку прынцыповага аналізу таго, што дасягнута, і вызначыць, што мы павінны зрабіць, вызначыць заганы і недахопы, якія перашкаджаюць нашаму руху наперад?

Важнейшай-жа ўмовай гэтага руху, важнейшай умовай развіцця нашай літаратуры павінны стаць прынцыповая партыйная ацэнка нашых дасягненняў і нашых недахопаў, выкараненне боязні і нецярпімасці да крытыкі і самакрытыкі.

Конкурс на лепшы плакат да 30-годдзя БССР

Саюзам мастакоў БССР быў аб'яўлены конкурс на серыю плакатаў да 30-годдзя БССР. Гэтымі днямі адбыўся прагляд прадстаўленых работ. Журы конкурса ў складзе народнага мастака БССР З. Азгура, заслужанага мастака БССР М. Керзіна, дырэктара Дзяржаўнага выдавецтва БССР З. Матузава, мастакоў Б. Малкіна і У. Сухаверхава адобрыла і прыняла 5 плакатаў, з іх чатыры выкананы каляктывам мастакоў: С. Раманавым, Е. Тарасам, Н. Гуціевым і адзін плакат выкананы П. Астроўскім. Два плакаты атрымалі прэмії.

Дзяржаўнае выдавецтва БССР да 30-годдзя рэспублікі адобраныя плакаты выпусціць масавым тыражом.

Гарадскі агляд мастацкай самадзейнасці

Гэтымі днямі ў г. Віцебску прайшоў агляд мастацкай творчасці шматлікіх самадзейных каляктываў горада.

Найбольш поўна на аглядзе былі прадстаўлены харавыя каляктывы.

Выгадна вылучыўся сваёй зладжанасцю майстэрствам выканання хор работніц фабрыкі «КІМ». З пачуццём і на высокім мастацкім узроўні выканаў ён песні «Мы—беларусы», «Дзяўчынанька, шуміць гай» і рад песень совецкіх кампазітараў.

Заслугоўвае ўвагі і хор работнікаў дыванна-плюшавага камбіната. Хор арганізаваўся ўсяго некалькі месяцаў назад і за кароткі час ужо дасягнуў значных поспехаў.

Нядрэнныя здольнасці паказалі харавыя каляктывы Аблбудтрэста, завода заточных станкоў, арцелі «8 сакавіка» і фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

Выдатна выканаў некалькі твораў совецкіх кампазітараў і рускай народнай музыкі духавы аркестр пад кіраўніцтвам тав. Цэйтліна. Аднак, трэба адзначыць, што аркестры былі прадстаўлены на аглядзе надзвычай бедна.

Сярод выканаўцаў-адзіночак неабходна адзначыць здольных спевакоў-салістаў т. т. Сідарэнка (Аблбудтрэст), Цыкун (ф-ка «Сцяг індустрыялізацыі»), Канькову (дыванна-плюшавы камбінат), Вішнякову (ф-ка «КІМ»), Карабкову (медыцынскі інстытут), Багушэвіч (педагагічны інстытут) і інш.

(Наш кар).

Рэспубліканская нарада маладых пісьменнікаў

З 16 па 20 кастрычніка адбывалася рэспубліканская нарада маладых пісьменнікаў, скліканая ЦК ЛКСМБ і Саюзам совецкіх пісьменнікаў БССР. Гэтая нарада, па ліку—другая, праведзеная пасля Вялікай Айчыннай вайны. У яе рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР—крытык тав. Броўман і паэт Нікалай Рылянкоў.

Нараду адкрыў уступнай прамовай Галоўны сакратар Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР П. Броўка.

Затым змястоўны даклад на тэму «Асноўныя элементы мастацкага твора» зрабіў І. Гутараў. Беручы прыклады з лепшых твораў сучасных беларускіх і рускіх пісьменнікаў, з твораў рускіх і заходнееўрапейскіх класікаў, дакладчык паказаў, як лепшыя пісьменнікі мінулага і сучаснага ўмела выкарыстоўвалі мастацкія элементы твора для выяўлення сваіх ідэй, для глыбокага і ўсебаковага адлюстравання жыцця.

З дакладам «Совецкая літаратура на сучасным этапе і задачы маладых пісьменнікаў» выступіў маскоўскі крытык тав. Броўман. Аналізуючы лепшыя творы, напісаныя ў пасляваенны час, ён гаварыў аб асноўных тэндэнцыях, якія ўжо акрэслена намеціліся ў сучаснай совецкай літаратуры і, у прыватнасці, у такіх творах, як «Маладая гвардыя» А. Фадзеева, «Далёка ад Масквы»—В. Ажаева, «Спадарожнікі» і «Кружыліха»—В. Панавай, «Звязда»—Э. Казакевіча, «Кавалер Залатой звязды»—С. Бабаеўскага, «Шчасце»—П. Паўленкі і іншых творах, адзначаных Сталінскімі прэміямі.

Даклад «Асаблівасці паэтыкі Янкі Купалы» зрабіў Максім Лужанін. На разглядзе творчасці народнага паэта дакладчык паказаў, як вялікі майстра слова Янка Купала ўсёй сумай вобразных сродкаў дамагаўся ў сваіх творах найбольш яснага і поўнага выяўлення думак.

Пасля дакладаў распачалі работу секцыі паэзіі, прозы, драматургіі.

17 кастрычніка маладыя пісьменнікі знаёміліся з аднаўленнем і будаўніцтвам Мінска.

Архітэктар тав. Кароль правёў з імі гутарку на тэму «Мінск у будучыні».

Удзельнікі нарады прынялі ўдзел у паседжанні пашыранага Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў, якое адбывалася 20 і 21 кастрычніка.

Работа секцыі прозы

Маладыя беларускія празаікі на паседжанне секцыі прозы прынеслі свае новыя творы. Паседжанне, у рабоце якога прынялі ўдзел пісьменнікі Янка Маўр, Янка Брыль, Макар Паслядовіч, Піліп Пестрак і іншыя, пазнаёмілася з гэтымі творамі і абмеркавала іх.

Асаблівае ўхваленне прысутных і кіраўнікоў секцыі выклікаў раман маладога празаіка Міколы Ткачова «Агні Сожа». Твор прысвечаны ўсенароднай партызанскай барацьбе працоўных Беларусі ў дні Вялікай Айчыннай вайны. На прыкладзе жыцця і баявой дзейнасці аднаго раёна, акупіраванага немцамі, аўтар малюе шырокую карціну партызанскай вайны на беларускай зямлі. У шырыні ахопу падзей, у паказе масавасці партызанскага руху—адна са станоўчых якасцяў рамана М. Ткачова. Пісьменнік малюе працэс зараджэння і развіцця гераічнай дзейнасці народных мсціўцаў, паказвае нязломны дух совецкіх патрыётаў у цяжкую для Радзімы гадзіну. У рамане партызанскі рух выведзены, як свядомае змаганне, кіруемае большэвіцкай партыяй. Цікавымі з'яўляюцца вобразы камандзіра партызанскай брыгады Злобіча, сакратара райкома партыі Камлюка, падпольшчыцы-сувязной Надзі.

Недахопы рамана М. Ткачова — наяўнасць лішняга матэрыялу, які абцяжарвае твор, публіцыстычна-газетная мова.

Станоўча была ацэнена і аповесць пачынаючай пісьменніцы Ларысы Усіменкі «Дачка народа». Аповесць паказвае гераічнае жыццё совецкай жанчыны-патрыёткі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў падполлі, у тыле ворага, а пасля вызвалення—яе самаадданую працу на свабоднай зямлі. Твор вабіць свежасцю, шчырасцю і непасрэднасцю пачуцця, з якім ён напісаны. Намаляваныя пісьменніцай вобразы (урач Зоя Шуміліна, сувязны Грыша, Сяргей і інш.) пераканальныя і праўдзівыя. Псуе аповесць некаторая лакіроўка рэчаіснасці, якая заўважаецца ў канцы аповесці; аўтар яшчэ не заўсёды ўмее выбраць галоўнае, характэрнае і без патрэбы спыняецца на другарадным. Больш уважліва павінна ставіцца Л. Усіменка і да мовы.

Варта адзначыць першую частку рамана П. Дудо «Полымя» — аб баях на Курскай дузе. Аўтар ведае матэрыял, аб якім піша. Яго герой — салдат, адданы сын радзімы. У рамане ёсць добрыя мастацкія дэталі, удала выпісаныя характары. Аднак, твор яшчэ патрабуе значнай дапрацоўкі, перш за ўсё пісьменнік павінен пазбегнуць стылявых неахайнасцяў, зрабіць мову дзейных асоб больш жывой і выразнай, адкінуць фальшывую патэтыку, якая іншы раз прарываецца ў аўтара.

З астатніх твораў, разгледжаных на паседжанні, вылучаюцца апавяданні на калгасную тэматыку М. Даніленкі і К. Папкоўскага.

Паседжанне секцыі прозы паказала, што ў нашу літаратуру прыходзяць новыя аўтары, якія, пры ўмове няспыннай творчай вучобы і працы над сабой, напішуць цікавыя творы пра совецкую рэчаіснасць.

У паэтычнай секцыі

Калі параўноўваць якасць паэтычных твораў, якія разглядаліся на гэтай нарадзе, з паэтычнымі творамі, што разглядаліся на мінулагодняй нарадзе, то можна зрабіць вывад: літаратурная моладзь за год сваёй работы дамаглася пэўных поспехаў. Гэтыя поспехі выявіліся галоўным чынам у значным авалоданні паэтычным майстэрствам. Праўда, яшчэ рана пакуль што гаварыць аб уласным голасе таго ці іншага паэта, але ў многіх з іх заўважаецца ўменне па-свойму вырашыць тэму, знайсці для выяўлення думак трапныя мастацкія дэталі.

На паэтычнай секцыі былі разгледжаны і абмеркаваны творы І. Цімашкова, С. Гаўрусёва, Х. Жычкі, Н. Чарняева, У. Корбана, В. Матэвушава, Н. Пашкевіча, Е. Лось, М. Цялічкі, А. Бажко, А. Пысіна, В. Гельтмана і І. Муравейкі.

Найбольшай увагі заслугоўваюць творы У. Корбана, В. Матэвушава, А. Пысіна, Е. Лось, С. Гаўрусёва і В. Гельтмана.

У. Корбан піша байкі. Па тэматыцы яны вельмі актуальныя, закранаюць найбольш злобадзённыя пытанні нашай сучаснасці. Паэт у сваіх творах асуджае гультайства («Вавёрка і вуж»), неаператыўнасць у працы («Аператыўнасць»), пядбайныя адносіны да захавання калгаснага дабра («Калгасны ўраджай»), людзей, якія любяць выхваляцца сваёй работай, хоць работы імі зроблена занадта мала («Куры»), асуджае тых, каму пахвальба кружыць галовы, і яны перастаюць рэагаваць на благія ўчынкі («Гуркі») і многія іншыя з'явы, што з'яўляюцца ў нашым жыцці рэшткамі старога ладу ў свядомасці совецкіх людзей. Але побач з актуальнасцю тэмы, народнасцю мовы, закончанасцю, многім байкам У. Корбана замінае яшчэ ў асобных выпадках і несур'ёзная мараль, і нехарактэрнасць у выбары персанажаў («Вавёрка і вуж»), і часамі лішняя мараль у заключнай частцы байкі («Аператыўнасць»).

А. Пысін прачытаў свае вершы «Магілёўскі шоўк», «Сняжынкі», «Воблака», «Мост». Тэматычна яго творы—надзённыя, вызначаюцца свежай думкай. А. Пысін умее апаэтызаваць звычайныя рэчы, даць ім новае асвятленне. Па вершах адчуваецца, што аўтар удумліва працуе над вобразам, над радком. Добра і тое, што ў свае творы ён уносіць мясцовы каларыт. Нават самі назвы «Магілёўскі шоўк» і інш. гавораць, што падзеі, апісаныя аўтарам, маюць дачыненне да Магілёўшчыны. Да недахопаў яго творчасці трэба аднесці тое, што ў асобных яго вершах наглядаецца перайманне з твораў другіх паэтаў.

Вельмі непасрэдныя, пачуццёвыя вершы Е. Лось.

Свежасцю вобразаў звяртаюць на сябе ўвагу вершы С. Гаўрусёва. Тэматычна ў выгадным святле вылучаюцца вершы В. Гельтмана, які піша пра жыццё горада, рабочых. Адчуваецца, што аўтар мае добрую наглядальнасць, але яму нехапае прафесійных, літаратурных ведаў, пачуцця меры. Гэта часамі прыводзіць да таго, што ён у адным і тым-жа вершы вырашае некалькі тэм («Мой Мінск»). У выніку—твор кампазіцыйна не мае цэласнасці і распадаецца на паасобныя самастойныя часткі.

Агульным недахопам для многіх паэтаў, якія чыталі свае творы на секцыі, з'яўляецца слабае адлюстраванне падзей сённяшняга жыцця, неахайнасць мовы, адсутнасць арыгінальных вобразных сродкаў, стары падыход да вырашэння новай тэмы.

Паэтычная моладзь павінна несці ў літаратуру не толькі свежыя вобразы і дэталі, але і новае бачанне жыцця, новы светапогляд совецкага чалавека.

У рабоце паэтычнай секцыі прынялі ўдзел П. Броўка, М. Танк, Н. Рылянкоў, П. Панчанка, М. Лужанін, А. Бялевіч, К. Кірэенка і інш.

У СЕКЦЫІ КРЫТЫКІ

Паседжанне секцыі крытыкі было прысвечана абмеркаванню аповесці І. Шамякіна «Глыбокая плынь», новага зборніка А. Астрэйкі «Добры дзень» і артыкулаў пра творчасць А. Бялевіча.

Крытык Ул. Агіевіч у сваім выступленні спыніўся галоўным чынам на недахопах аповесці І. Шамякіна і выказаў сваю нязгоду з ацэнкай паасобных момантаў твора, дадзенай Я. Герцовічам у артыкуле, які быў надрукаваны ў газеце «Звязда». Жыццё сям'і Маеўскіх, зазначыў ён, паказана аўтарам некалькі ідылічна, прыфарбавана. Не раскрыты ў «Глыбокай плыні» вобраз Мікалая Маеўскага, які атрымаўся павярхоўным, непераканальным. Няўдалая сітуацыя з разведчыкам Андрэём Буйскім. Пісьменнік часта захапляецца дэталямі і выпускае з-пад увагі галоўнае. Мала пераканальны ў творы вобраз Тані. Аўтар абмежаваў яе інтэлектуальныя дадзеныя, зрабіўшы яе другарадным вобразам. Я. Герцовіч павінен быў больш рэзка гаварыць аб недахопах аповесці, звярнуць увагу пісьменніка на тое, каб ён больш ішоў ад жыцця, а не ад літаратуры.

— Прыход І. Шамякіна ў літаратуру,— сказаў А. Кучар, — прыемная з'ява. Новая яго аповесць чытаецца добра і цікава, яна мае займальную фабулу, аўтар умее будаваць сюжэт. У творы шмат трапных дэталяў, удалых аўтарскіх знаходак. Недахопы аповесці: пісьменнік не выдзеліў галоўнага героя, тым самым ён не даў чытачу ідэала для пераймання. Карп Маеўскі ў другой і трэцяй частках — значна слабейшы вобраз, чым у першай. Прыборны і Лясніцкі — безасабовыя людзі, героі без акрэсленых характараў. Мова твора нівеліраваная, невыразная. Але гэтыя недахопы не засланяюць мастацкай вартасці аповесці, і «Глыбокая плынь» павінна быць ацэнена, як станоўчая з'ява ў нашай літаратуры.

Ацэньваючы зборнік А. Астрэйкі «Добры дзень», прысутныя пагадзіліся на тым, што Астрэйка ў сваёй новай кнізе топчацца на месцы, паўтарае самога сябе, мастацкія сродкі яго трафарэтныя, зношаныя, свежага, свайго ў голасе паэта адчуваецца мала. Крытыкі прызналі няправільнай змешчаную ў газеце «Сталинская молодежь» рэцэнзію А. Бур'яна на зборнік «Добры дзень». Рэцэнзент захваліў кнігу А. Астрэйкі і не ўбачыў у ёй амаль ніякіх недахопаў.

Гарачыя спрэчкі на паседжанні выклікала абмеркаванне артыкулаў П. Панчанкі «Заганная ідэя, фальшывы герой» («Літаратура і мастацтва» № 39 ад 25 верасня) і Я. Герцовіча «Аб паэмах А. Бялевіча» («Полымя» № 8), прысвечаных разгляду творчасці А. Бялевіча.

Асаблівае пярэчанне сустрэла выступленне А. Кучара, які спрабаваў узяць пад абарону некаторыя творы Бялевіча. Але, абараняючы А. Бялевіча, крытык фактычна залішне жорстка паставіўся да творчасці паэта, у той-жа час перахваліўшы слабую ў ідэйных адносінах паэму «Дарога з няволі».

Максім Танк у сваім выступленні адзначыў, што па ранейшых паэмах А. Бялевіча можна прасачыць ідэйны рост паэта, па апошніх — толькі рост мастацкага боку яго таленту. Паэт вырас, але ў яго яшчэ шмат наіўнага, надуманага, ўмоўнага.

— А Кучар груба паставіўся да ацэнкі твораў А. Бялевіча,—сказаў Я. Герцовіч,—выкрэсліў з творчасці паэта цэлыя паэмы. У Бялевіча ёсць адрыў формы ад зместу, паэт слаба працуе над ідэйным бокам сваіх твораў.

Трэба адзначыць, што пытанні, пастаўленыя на абмеркаванне секцыі крытыкі, не мелі непасрэднага дачынення да нарады маладых пісьменнікаў.

У спрэчках таксама выступілі Ул. Агіевіч, П. Кавалёў, Р. Шкраба і іншыя.

* * *

На драматургічнай секцыі крытыкамі—М. Клімковічам і А. Есаковым былі разгледжаны аднаактныя п'есы маладых драматургаў — Змачынскага і Макаёнка.

* * *

Учора, 22 кастрычніка, удзельнікаў нарады маладых пісьменнікаў прыняў сакратар ЦК КП(б)Б таварыш Іаўчук М. Т.

У Саюзе пісьменнікаў БССР

На працягу двух дзён адбывалася пашыранае паседжанне Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, прысвечанае абмеркаванню важнейшых задач, якія стаяць перад беларускімі пісьменнікамі ў сувязі з падрыхтоўкай да 30-годдзя БССР.

З дакладам «Беларуская совецкая літаратура на сучасным этапе і яе задачы да 30-ай гадавіны БССР» выступіў П. Броўка.

Дакладчык зазначыў, што пасля гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) аб часопісах «Звязда» і «Ленінград» і даклада таварыша Жданава, а таксама пасля пастановы ЦК КП(б)Б аб становішчы беларускай совецкай літаратуры нашы пісьменнікі напісалі нямала твораў на актуальныя тэмы: раман А. Стаховіча — «Пад мірным небам», аповесці М. Паслядовіча — «Цёплае дыханне», У. Краўчанкі — «Рыгор Шыбай», Т. Хадкевіча — «Вяснянка», а таксама апавяданні І. Мележа, І. Грамовіча, Я. Брыля, П. Пестрака, А. Кулакоўскага і інш. З паэтычных твораў вызначыліся: новая паэма Якуба Коласа «Рыбакова хата», вершы М. Танка, П. Панчанкі, В. Таўлая, М. Засіма, паэмы А. Бялевіча і інш.

П. Броўка падрабязна спыняецца на разглядзе аповесцяў І. Шамякіна — «Глыбокая плынь», А. Кулакоўскага — «Гартаванне», Т. Хадкевіча — «Вяснянка», П. Пестрака — «Пачатак», запісак Героя Совецкага Саюза В. Лівенцава «Партызанскі край» у літаратурнай апрацоўцы Р. Няхая і раду апавяданняў.

Броўка робіць агляд апошніх паэтычных твораў, спыняецца на паэме А. Куляшова «Повае рэчышча», А. Бялевіча — «Дарога з няволі», на казцы В. Віткі — «Вавёрчына гора», на паэмах Э. Агняцвет—«Дарога ў будычыню», М. Калачынскага—«Сонца ў блакіце», на вершах М. Танка, К. Кірэенкі, А. Вялюгіна, М. Аўрамчыка, М. Гамолкі і інш.

Характарызуючы становішча крытыкі, П. Броўка гаворыць, што крытыка, акрамя асобных работ па літаратуразнаўству, не дала колькі-небудзь значных артыкулаў, якія-б прапагандавалі новае ў жыцці, ідэі комунізма.

У заключэнні П. Броўка заклікае ўсіх пісьменнікаў мабілізаваць свае творчыя сілы, каб варта адзначыць слаўную гадавіну.

З дакладам «Індустрыяльная тэма ў беларускай літаратуры» выступіў І. Мележ.

Пасля дакладаў пачаліся спрэчкі.

А. Міронаў сваё выступленне прысвячае рабоце членаў рускай секцыі ў падрыхтоўцы да 30-годдзя БССР.

З аналізам некаторых літаратурных працэсаў беларускай літаратуры выступіў М. Клімковіч.

Аб рабоце дзіцячых пісьменнікаў да 30-годдзя БССР гаварыў у сваім выступленні А. Якімовіч.

В. Барысенка спыніўся на пытаннях адставання сучаснай беларускай крытыкі ад задач жыцця.

У спрэчках таксама выступілі А. Кучар, Я. Герцовіч, В. Матэвушаў, І. Цімашкоў, М. Модэль і П. Чарняеў.

На паседжанні Праўлення ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР прыняты М. Ткачоў, П. Чэрных, В. Матэвушаў, У. Корбан, Р. Шкраба і Я. Герцовіч.

Літаратурныя вечары

Гомельскай абласной бібліятэкай імя Леніна ў клубе працоўных рэзерваў днямі быў арганізаваны літаратурны вечар.

У вечары прынялі ўдзел вучні рамесніцкіх вучылішчаў і ФЗН, студэнты педінстытута і тэхнікумаў, настаўнікі гарадскіх школ.

Загадчык кафедры беларускай літаратуры і мовы педінстытута тав. Бірукова на вечары прачытала даклад на тэму «Беларуская совецкая літаратура за 30 год існавання БССР». Многія ўдзельнікі вечара выступілі з мастацкім чытаннем лепшых твораў сучаснай беларускай літаратуры.

Такія вечары рыхтуюцца ў сярэдніх школах горада, тэхнікумах і педінстытуце.

* * *

Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна арганізавала канфярэнцыю чытачоў на тэму: «Вобраз маладога чалавека сталінскай эпохі ў творах совецкай літаратуры». Чытачы гаварылі аб высокіх маральных якасцях герояў рамана А. Фадзеева «Маладая гвардыя» і аповесці М. Бубенава «Белая бяроза». У канфярэнцыі прыняла ўдзел каля 200 чалавек.

Кіноабслугоўванне насельніцтва

За апошні час значна палепшылася кіноабслугоўванне вясковага насельніцтва ў Дзятлаўскім раёне, Баранавіцкай вобласці.

Толькі за жнівень і верасень месяцы бягучага года кіноперасоўкі райаддзела кінофікацыі абслужылі 130 населеных пунктаў. Насельніцтву былі паказаны кінофільмы «Моладзь нашай краіны», «Чапаеў», «Сыны», «Пашэсце» і інш. Гэтыя кінофільмы прагледзела звыш 7.000 чалавек.

М. ГОРЦАЎ

Некаторыя пытанні соцыялістычнага рэалізма ў беларускай совецкай літаратуры

Беларуская мастацкая літаратура прайшла вялікую творчую школу ў барацьбе з рознымі варожымі плынямі, якія насаджваліся трацкістамі, бухарынцамі, буржуазнымі нацыяналістамі і іх прыслужнікамі. У гэтай барацьбе наша літаратура ідэйна ўзмацнела, мастацкі ўдасканалілася, зрабілася сапраўды народнай, зрабілася літаратурай, якая адказвае патрабаванням сучаснасці—глыбока і асэнсавана адлюстроўваць нашу рэчаіснасць.

Усё гэта стала магчымым толькі дзякуючы таму, што беларускія совецкія пісьменнікі авалодалі метадам соцыялістычнага рэалізма.

У нашай літаратуры, як і ў гісторыі літаратур другіх народаў, таксама адбываліся гістарычныя працэсы развіцця метадаў, але паколькі наша літаратура ўзнікла значна пазней, чым іншыя, для яе ўласцівы—пераважна для дарэволюцыйнага перыяду—крытычны рэалізм з адценнем відавочнага натуралізма (Дунін-Марцынкевіч, Ф. Багушэвіч і інш.) ці рэволюцыйнага рамантызма (Янка Купала, М. Багдановіч). Гэтыя творчыя метады панавалі ў беларускай літаратуры і пасля Кастрычніцкай рэволюцыі, але з узрастаючай з года ў год перамогай соцыялістычнага ладу і, нарэшце, з ліквідацыяй эксплааператарскіх класаў і поўнай перамогай соцыялізма ў нашай краіне адбываецца перабудова беларускіх пісьменнікаў. Літаратары сталі пановаму падыходзіць да адлюстравання ў мастацкіх творах рэчаіснасці, якая ўвесь час пераўтваралася пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі; з ростам палітычнай свядомасці беларускіх пісьменнікаў і авалоданнем імі марксісцка-ленінскім светапоглядам мяняецца і іх літаратурны метад. Так, паступова адбываецца перабудова буйнейшых літаратараў—Янкі Купалы, Якуба Коласа, Зм. Бядулі і тых пісьменнікаў, якія прышлі ў літаратуру пасля грамадзянскай вайны, у перыяд НЭП'а, як П. Глебка, М. Лужанін, К. Чорны. Апрача гэтых пісьменнікаў, у беларускую літаратуру прышлі, праўда ў розны час, пісьменнікі, якія прайшлі ідэйную загартоўку ў грамадзянскай вайне, у совецкіх навучальных установах, у комсамоле, у падпольнай барацьбе пры панскай Польшчы. Да гэтай групы належаць М. Лынькоў, А. Куляшоў, П. Броўка, П. Трус, Э. Самуйлёнак, М. Танк, П. Пестрак, М. Засім, В. Таўлай, П. Панчанка, А. Стаховіч і іншыя.

Такім чынам, у перадваенны час беларуская літаратура складала значны атрад совецкіх пісьменнікаў, якія валодалі ўжо творчым метадам соцыялістычнага рэалізма. Народны паэт Янка Купала за зборнік вершаў «Ад сэрца» ў 1941 годзе атрымлівае Сталінскую прэмію I ступені. Тады-ж прысуджаецца Сталінская прэмія К. Крапіве за камедыю «Хто смяецца апошні». У 1939 годзе група беларускіх пісьменнікаў узнагароджваецца высокай урадавай узнагародай—ордэнамі Совецкага Саюза за сваю грамадска-палітычную і літаратурную дзейнасць (Янка Купала, Якуб Колас, Зм. Бядуля, Э. Самуйлёнак, М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка).

Вялікая Айчынная вайна неспадзявана парушыла творчыя планы нашых пісьменнікаў, як і ўсяго народа Совецкага Саюза; многім давялося замяніць пісьменніцкае пяро на стрэльбу ці перабудаваць сваю творчасць у адпаведнасці з запатрабаваннямі ваеннага часу.

Натхнёныя большэвіцкай партыяй і братняй падтрымкай вялікага рускага народа, беларускія літаратары, авалодваючы творчым метадам соцыялістычнага рэалізма, стварылі новыя высокаідэйныя, патрыятычныя мастацкія творы. Гады Вялікай Айчыннай вайны з'явіліся новым этапам у далейшым развіцці і росце нашай літаратуры. Пісьменнікі яшчэ больш удасканалілі метад соцыялістычнага рэалізма, выдатныя якасці якога—большэвіцкая непрымірымасць да ворага, сіла ўсенароднай нянавісці да захопнікаў і прыгнятальнікаў, незгасальная вера ў будучае, нястомнае імкненне наперад да поўнай перамогі комунізма—асабліва яскрава праявілася ў гады вайны.

Гістарычныя падзеі спрыялі таму, каб пісьменнікі больш глыбока адчулі і ўсвядомілі як мінулае, так і тое, што адбываецца ў жыцці нашага народа, убачылі ў ім новыя якасці, выхаваныя партыяй Леніна—Сталіна. Метад соцыялістычнага рэалізма даў магчымасць больш поўна і праўдзіва адлюстраваць совецкіх людзей. Лепшыя творы гэтага часу—Якуба Коласа, а затым Аркадзя Куляшова—былі адзначаны Сталінскай прэміяй.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны беларуская літаратура не спынілася на месцы. Паэты П. Броўка і М. Танк за новыя вершы аб жыцці і працоўных подзвігах народа ў пасляваенны перыяд таксама ўдастоены Сталінскіх прэмій. Цяпер нашы пісьменнікі ўзмоцнена працуюць над напісаннем новых манумянтальных твораў. У асаблівасці многа працуе моладзь, якая прыйшла ў літаратуру ў ваенныя і пасляваенныя гады. Яна настойліва авалодвае літаратурным майстэрствам. Праўда, маладыя аўтары не ўсе яшчэ вызначылі сябе, па-сапраўднаму авалодалі творчым метадам соцыялістычнага рэалізма. Нярэдка яны, імкнучыся праўдзіва адлюстраваць рэчаіснасць, упадаюць у натуралізм ці фармалізм, што скоўвае іх творчыя магчымасці.

Не ўсе яшчэ літаратары і старэйшага пакалення авалодалі метадам соцыялістычнага рэалізма, пагэтаму невыпадкова, што яны на працягу ўжо значнага часу або нічога не пішуць, або ствараюць няпоўнацэнныя літаратурныя творы. Такія пісьменнікі, як К. Буйла, В. Вольскі, А. Якімовіч, і некаторыя іншыя на працягу ўжо некалькіх год не напісалі ніводнага больш ці менш каштоўнага твора. А. Бялевіч, М. Лупсякоў, М. Садковіч і інш. дапусцілі ў сваіх творах гр'ёзныя ідэйныя памылкі.

Соцыялістычны рэалізм, як мы ўжо адзначылі, з'яўляецца асноўным метадам літаратуры. Ён узнік яшчэ ў першыя гады совецкай улады і цяпер дасягнуў значнага свайго развіцця. Стваральнікам яго тэорыі з'яўляецца І. В. Сталін. Вялікі правадыр на аснове марксісцка-ленінскага матэрыялістычнага вучэння вызначыў асноўныя прынцыпы соцыялістычнага рэалізма, назваўшы пісьменнікаў «інжынерамі чалавечых душ». Практычнае прымяненне гэтага метада на справе зрабіў А. М. Горкі. Яшчэ ў дарэволюцыйных яго творах выяўляюцца некаторыя рысы соцыялістычнага рэалізма. У беларускай літаратуры заснавальнікамі новага літаратурнага метада з'яўляюцца Янка Купала, Якуб Колас. Так, у вершы «Будзь смелым» (1918), а затым «Арлянятам» (1923) Янка Купала імкнецца праўдзіва адлюстраваць парасткі новага, кінуць погляд у будучыню. У вершы «Трэба нам песень» (1924) Янка Купала ставіць перад пісьменнікамі задачы па напісанню твораў, вартых велічнай совецкай эпохі.

Гэты заклік Янкі Купалы патрабаваў праўдзіва адлюстраваць рэчаіснасць на аснове метада соцыялістычнага рэалізма. У новым разуменні літаратуры ўжо няма нічога агульнага з літаратурнай дэкларацыяй Янкі Купалы, якая ім была выказана ў вершы «Я не паэт» (1906), дзе ён ставіў задачу «песняй сагрэць долю народа». Сам Янка Купала не абмяжоўваўся толькі заклікам. Справа тут ідзе не аб тым, што ў творчасці паэта змянілася пасля рэволюцыі тэматыка, што пачалі стварацца ім новыя вобразы. Галоўнае было ў тым, што ён па-новаму стаў падыходзіць да рэчаіснасці, услаўляючы ўрачыстасць новага соцыялістычнага ладу.

Аналізуючы творы буйнейшых пісьменнікаў апошніх год, патрэбна зрабіць вывад, што соцыялістычны рэалізм заключаецца, перш за ўсё, у праўдзівым, усебаковым і глыбокім адлюстраванні рэчаіснасці.

Але праўдзівасць вымяраецца не толькі тэматыкай, хаця гэты бок для соцыялістычнага рэалізма мае істотнае значэнне, а перш за ўсё ідэйнай накіраванасцю і выразнасцю мастацкага вобраза. Для літаратуры вобраз набывае адно з самых істотных значэнняў. Грамадскае значэнне вобраза не заўсёды залежыць ад жадання ці імкнення пісьменніка, яно яшчэ залежыць і ад тых сродкаў, г. зн. прыёмаў, якімі карыстаецца пісьменнік. Так, П. В. Гогаль, карыстаючыся метадам крытычнага рэалізма, стварыў у сваіх творах «Рэвізор» і «Мёртвыя душы» мастацкія і праўдзівыя вобразы ў супроцьлегласць сваім ідэйным імкненням.

Якія-ж прыёмы характэрны для соцыялістычнага рэалізма ў стварэнні вобраза? Аналізуючы рад лепшых твораў совецкай літаратуры, мы бачым, што пісьменнікі ў стварэнні вобраза зыходзяць не з выдумкі, а з самога жыцця. Як правіла, імі ў аснову вобраза бярэцца жывы чалавек, г. зн. той, які рэальна існуе ці існаваў. Так, для стварэння вобраза партызана Я. Колас у сваёй аповесці «Дрыгва» ўзяў прататыпам вядомага беларускага партызана дзеда Талаша. П. Броўка для стварэння вобраза перадавой совецкай жанчыны Кацярыны (з аднайменнай паэмы), якая ўзнялася ад простай батрачкі да дзяржаўнага дзеяча, бярэ правобразам адну з дэпутатак Вярхоўнага Совета БССР. Для Н. Астроўскага ў стварэнні вобраза Паўкі Карчагіна паслужыла прыкладам уласнае жыццё. Аналагічных выпадкаў, калі аўтар для стварэння вобраза выкарыстоўвае сваю біяграфію ці біяграфію другіх людзей, добра яму вядомых, можна прывесці вельмі многа. Гэта не нова як для сучаснай, так і для дарэволюцыйнай літаратуры, але гэта з'яўляецца непарушным законам для рэалістычнага метада. Вось чаму для нашай сучаснай літаратуры стала характэрным тое, што за кожным створаным поўнакроўным вобразам стаіць жывы прататып. Там, дзе яго няма, няма і мастацкага вобраза. Так, напрыклад, у рамане «Маладая гвардыя» А. Фадзеева мы бачым сапраўдныя мастацкія вобразы герояў-комсамольцаў таму, што прататыпамі іх аўтар узяў краснадонскіх «маладагвардзейцаў», і, наадварот, там, дзе ён стварыў у гэтым рамане вобразы, якія не маюць канкрэтнага жыццёвага прататыпа, там вобраз атрымаўся слабым, непераканальным. Асабліва добра гэта можна прасачыць на творах маладых ці пачынаючых пісьменнікаў. Так, напрыклад, беларускі драматург А. Маўзон у сваёй п'есе «Канстанцін Заслонаў», К. Губарэвіч і І. Дорскі ў п'есе «Цэнтральны ход» не заўсёды зыходзілі з рэальных прататыпаў. Тыя вобразы, якія імі ствараліся па ўласнаму ўяўленню, атрымаліся непераканальнымі. Усе гэтыя прыклады толькі сведчаць пра тое, што метад соцыялістычнага рэалізма патрабуе ад мастака зыходзіць з канкрэтнага рэальнага факта. Але аднаго гэтага яшчэ мала. Інакш пісьменніку не патрэбна было-б ствараць, а толькі паспяваць фатаграфаваць ці капіраваць рэчаіснасць. Значыць, неабходна яшчэ жыццёвы факт творча асэнсаваць, унікнуць выпадковага, другараднага і дапоўніць яго ўласным вопытам.

Для гэтага пісьменнік павінен дамагацца, каб герой дзейнічаў так, як дзейнічала-б большасць людзей яго класа ці той групы людзей, да якой ён належыць па сваіх ідэйных поглядах. Скажам, герой Я. Коласа з аповесці «На прасторах жыцця»—Сцяпан Барута пасля сваркі з бацькам за «знявагу рэлігіі» пакідае родную хату і ідзе вучыцца ў горад. Ці заканамерна гэта для сялянскага хлапчука, які далучыўся да комсамола? Не толькі заканамерна, але і тыпова для таго часу. Тысячы такіх Сцяпанаў пасля грамадзянскай вайны ўступалі ў комсамол, мелі сутычкі з бацькамі на рэлігійнай глебе, пакідалі свае хаты і ішлі ў горад вучыцца. А калі-б Я. Колас прымусіў свайго героя як-небудзь інакш дзейнічаць, можна з упэўненасцю сказаць, што праўдзівага рэалістычнага вобраза не атрымалася-б. Так, напрыклад, у п'есе «Заложнікі» А. Кучар ставіць калгасніка Нічыпара ў нетыповыя, выдуманыя ўмовы, прымушае чытаць евангеліе, а адну з дочак з першых-жа сустрэч з нямецкім афіцэрам—пусціцца ў распусту, другую пры адступленні Чырвонай Арміі яшчэ да прыхода немцаў прымушае праганяць з дому параненага палітрука, пагражаць выдаць яго немцам. Ці ўласцівы такія ўчынкі совецкім людзям? Безумоўна, не. Значыць, рэалістычны метад патрабуе ад аўтара, каб учынкі яго герояў былі заканамернымі, тыповымі і характэрнымі, інакш парушаецца рэалістычны прынцып адлюстравання рэчаіснасці, г. зн. не раскрываецца, а скажаецца жыццёвая праўда. Пісьменнік павінен вывучаць жыццё, наглядаць за дзеяннямі людзей, накапляць і абагульваць фактычны матэрыял для стварэння мастацкага вобраза. Тут нельга дапускаць сляпога паўтарэння жыцця. Неабходны глыбокі аналіз, бо чалавек, жывучы ў грамадстве, у сваіх дзеяннях залежыць ад грамадскага асяроддзя. Дзеянні і ўчынкі чалавека адбываюцца не ізалявана, а ў канкрэтных рэальных умовах. Гэтыя ўмовы не толькі ствараюць фон для дзеяння героя, а як правіла, складаюць неад'емную дэталь у стварэнні вобраза. Толькі пры дапамозе паказа канкрэтных умоў ствараецца магчымасць найбольш поўнага раскрыцця вобраза. Больш таго, толькі паказам канкрэтных умоў, у якіх дзейнічае герой, вызначаецца правільнасць, г. зн. заканамернасць дзеянняў. Гэта значыць, умовы, у якіх дзейнічае герой, павінны знаходзіцца ў поўнай узаемасувязі і ўплыве з дзеяннямі. Рэалізм патрабуе, каб умовы, у якіх дзейнічае герой, былі жыццёвымі, праўдзівымі, а не выдуманымі. У гэтых пытаннях вялікае значэнне для стварэння вобраза заключаецца ў правільным выбары канкрэтнай дэталі.

Праз дэталь, якая павінна быць адначасова і тыповай і канкрэтнай, пісьменнік дасягае вобразнага адлюстравання жыцця, якое складаецца з двух істотных і характэрных момантаў абагульнення і індывідуалізацыі. Ад правільнасці спалучэння гэтых якасцяў у значнай ступені залежыць сіла і характар вобраза, яго грамадскае і мастацкае значэнне. Аднак, толькі гэтых рыс, г. зн. «праўдзівага адлюстравання праўдзівых людзей, з праўдзівымі, г. зн. тыповымі іх дзеяннямі ў тыповых характэрных умовах», для поўнай характарыстыкі соцыялістычнага рэалізма недастаткова.

Неах'емнай якасцю соцыялістычнага адлюстравання з'яўляецца прынцып партыйнасці. Пісьменнік, які занядбаў партыйнасць у сваім творчым метадзе, непазбежна становіцца на пункт гледжання буржуазнага аб'ектывізма і тым самым пазбаўляе сябе магчымасці правільна зразумець і абагуліць рэчаіснасць і, як правіла, скачваецца ў сваім творчым метадзе ці да фармалізма, ці да грубага натуралізма, г. зн. адсякае сабе шлях да сапраўднага мастацтва. Партыйнасць-жа не абмяжоўвае пісьменніка, а, наадварот, пашырае яго магчымасці як мастака, прыводзіць да народнасці.

Прынцып партыйнасці азначае, што пісьменнік малюе рэчаіснасць свабодна, не ў інтарэсах якіх-небудзь асабістых выгад, не для таго, каб патрапіць выбранай кучцы эстэтаў, а ў інтарэсах шырокіх народных мас, у інтарэсах барацьбы за комунізм. Партыйнасць і народнасць з ідэйнай накіраванасцю непарыўна звязаны. Там, дзе ў пісьменніка партыйнасць займае першаступеннае значэнне, там ён дасягае сапраўднай народнасці, сапраўднай большэвіцкай палымянасці, г. зн. надае твору той характар, якім вызначаецца соцыялістычнае мастацтва. Прыкладам гэтага можа служыць творчасць нашых пісьменнікаў у ваенныя гады, у час барацьбы з нямецкім фашызмам.

Соцыялістычны рэалізм дае шырокія магчымасці для пісьменніка ў паказе сучаснага чалавека, яго грамадскай дзейнасці, багацця яго пачуццяў, яго псіхалогіі, побыту. Прычым, метад соцыялістычнага рэалізма не толькі праўдзіва адлюстроўвае жыццё, а раскрывае яго для пазнання. Соцыялістычны рэалізм патрабуе пэўных адносін пісьменніка да фактаў. Да ўсяго новага, станоўчага, няхай гэта будзе ў зародку, ён павінен з любоўю адносіцца, і ўсё, што аджыло, што перашкаджае нашаму народу рухацца наперад да комунізма, павінна бязлітасна падвяргацца крытыцы, знішчэнню.

Вельмі важным пытаннем соцыялістычнага рэалізма з'яўляецца пытанне аб адзінстве формы і зместу мастацкага твора. У залежнасці ад агульнага вырашэння ўзаемаадносін формы і зместу вынікаюць суадносіны формы і зместу ў літаратуры. Каб змест існаваў, ён павінен мець форму, якая прыдае яму знешнюю выразнасць, інакш ён не зможа праявіць сябе. Змест і форма ўзаемна звязаны і абумоўлены. «Развіццё зместу ідзе наперадзе ўзнікнення і развіцця формы» (Сталін). Што-ж мы можам лічыць зместам і формай літаратурнага твора і якое выяўленне яны знаходзяць пры метадзе соцыялістычнага рэалізма?

Літаратурны твор ёсць вынік дзейнасці пісьменніка, выяўленне яго свядомасці. Зместам свядомасці чалавека з'яўляецца сама рэчаіснасць, якая пазнана чалавекам і атрымала ў яго ўспрыйманні тую ці іншую афарбоўку. Выходзіць, што, гаворачы аб змесце твора, мы гаворым аб рэчаіснасці, маючы на ўвазе пазнанне рэчаіснасці пісьменнікам і адлюстраванне яе ў творы, г. зн., гаворым аб з'явах, фактах жыцця, якія ўвасоблены пісьменнікам у творы. Больш поўнае, глыбокае і ўсебаковае адлюстраванне рэчаіснасці можа даць рэалістычны твор. Такім чынам, метад соцыялістычнага рэалізма набывае для сучаснай літаратуры першаступеннае значэнне.

Каштоўнасць праўдзівага і мастацкага твора вымяраецца не формай яго, а зместам, г. зн. глыбінёй і значымасцю для народа той ідэі, якая ў творы заложана. Калі ў творы ідэя пустая, заганная,—такі твор не толькі не патрэбен, але і шкодны, бо ён не толькі не дапамагае ў агульнай справе комуністычнага выхавання, а, наадварот, з'яўляецца перашкодай у справе соцыялістычнага будаўніцтва. Цэнтральны Камітэт ВКП(б) у сваіх гістарычных рашэннях па пытаннях літаратуры і мастацтва даў вычарпальнае абгрунтаванне значэння высокай ідэйнасці. Няма неабходнасці даводзіць усю глыбіню і значымасць рашэнняў ЦК ВКП(б) па гэтаму пытанню.

Як вядома, актуальнасць твора залежыць, перш за ўсё, ад яго тэматыкі. Калі пісьменнік выбірае для свайго твора тэму, якая закранае шырокія народныя колы, цікавіць і хвалюе чытача, то тэма, безумоўна, актуальная.

Тэма — ёсць кола тых жыццёвых з'яў, якія пісьменнік лічыць тыповымі ў рэчаіснасці і на якія ён імкнецца звярнуць увагу. А гэта ўжо залежыць ад творчага метаду пісьменніка. Калі ён адыходзіць ад рэчаіснасці і бярэ з яе незаконамерныя, г. зн. выключныя з'явы, дык гэтым самым ён у сваім творчым метадзе адыходзіць ад рэалізма. «Тэма,—як гаворыць Горкі,—гэта ідэя, якая нарадзілася ў вопыце аўтара, падказваецца яму толькі жыццём, але гняздзіцца ва ўмясцілішчы яго ўражанняў яшчэ неаформлена і, патрабуючы ўвасаблення ў вобразах, узбуджае ў ім заклік да працы, яе афармлення». У адборы жыццёвых з'яў, фактаў для адлюстравання мае ўплыў і пісьменніцкая ацэнка гэтых фактаў, разуменне іх, а гэта ўжо ў многім залежыць ад творчага метада аўтара. Значыць, калі тэматыка пісьменніка залежыць ад яго творчага метаду, то яшчэ ў большай ступені ад метада залежыць ідэйная накіраванасць твора ў літаратуры. Соцыялістычны рэалізм з'яўляецца адзіна правільным метадам для адлюстравання нашай рэчаіснасці, а ўсялякія іншыя літаратурныя метады затрымліваюць развіццё літаратуры і вядуць яе ў тупік. Пісьменнік, які не валодае метадам соцыялістычнага рэалізма, не здольны праўдзіва адлюстраваць нашу рэчаіснасць.

Такім чынам, пераход зместа ў форму ў літаратурным творы ажыццяўляецца, перш за ўсё, як пераход ідэйна-тэматычнай асновы ў канкрэтныя вобразы, чалавечыя характары, учынкі, якія канкрэтызуюць адлюстраванне рэчаіснасці. Усё гэта мае непасрэдныя адносіны да творчага метада. Значыць, змест твора вынікае з творчага метада пісьменніка.

Як вядома, у мастацкім творы можа быць адна або дзве ідэі, тым не менш на асноўную з іх пісьменнік імкнецца адказаць, г. зн. даць вывад, або непасрэдна падвесці чытача да яго. Але вывад пісьменнік можа зрабіць не заўсёды правільны, калі ён не карыстаецца метадам соцыялістычнага рэалізма. Так, Гогаль у «Мёртвых душах», карыстаючыся метадам крытычнага рэалізма, глыбока паказаў крызіс прыгонніцтва, але ў той-жа час не змог зрабіць тых правільных вывадаў, якія падказваліся самім матэрыялам. Тое самае мы наглядаем і ў творах Л. Талстога, Пушкіна, Тургенева і інш., у той час, як гэтых памылак мы не маем у творах, напісаных у стылі соцыялістычнага рэалізма. Тут, безумоўна, мае значэнне светапогляд пісьменніка, але тым не менш мы ведаем, што адзін і той-жа совецкі пісьменнік іншы раз піша твор з ідэйна-памылковым вывадам толькі таму, што адыходзіць у сваёй творчасці ад адзіна правільнага метада соцыялістычнага рэалізма. Больш таго, калі нават пісьменнік у сілу сваёй непадрыхтаванасці не можа зрабіць правільны вывад, то, будучы рэалістам, чытач сам зробіць правільны вывад, і такі твор сваёй каштоўнасці не страціць.

Праяўленне творчага метада мае ўплыў і па мастацкія сродкі твора.

Да найбольш грунтоўных сродкаў мастацкага твора належыць мова і кампазіцыя. Гэтыя сродкі з'яўляюцца неад'емнымі кампанентамі мастацкага твора. Пры дапамозе іх пісьменнік дасягае як сілы выразнасці твора, так і эмацыянальнасці.

Горкі, характарызуючы значэнне мовы, як мастацкага сродка пісьменніка, гаварыў: «Таксама, як токар па металу і дрэву, літаратар павінен ведаць свой матэрыял—мову слова, інакш ён будзе не ў стане выказаць свой вопыт, свае адчуванні, думкі, не здолее стварыць малюнкаў, характараў і г. д.».

Толькі метад соцыялістычнага рэалізма дае магчымасць паказаць жыццёвы працэс у яго канкрэтных формах, у непасрэдных яго праяўленнях, прымяняльна да дзейнасці канкрэтна адлюстраванага чалавека.

Насустрач 30-годдзю ВЛКСМ

Вялікую святочную праграму, прысвечаную 30-годдзю ВЛКСМ, рыхтуе Мінская Кансерваторыя і Музычнае вучылішча. У праграму канцэртаў увойдуць творы рускіх і беларускіх кампазітараў аб барацьбе і працы Ленінска-Сталінскага комсамола. Камітэт комсамола разам з дырэкцыяй Кансерваторыі і Музычнага вучылішча склаў 5 канцэртных брыгад, якімі кіруюць лектары т. т. Смольскі, Ракава, Гадлеўская, Тамашова і Ваксэр. У кожную з гэтых брыгад уваходзіць па 9 чалавек студэнтаў.

Гэтымі днямі брыгады праводзяць рад святочных канцэртаў на аўтамабільным заводзе, трактарным, радыёзаводзе, а таксама ў падшэфным калгасе «Перамога», Емельянаўскага сельсовета, Смалявіцкага раёна, Мінскай вобласці.

* * *

У дзень святкавання 30-годдзя ВЛКСМ міжабласны ансамбль песні і танца былых партызан, які знаходзіцца ў Маладзечні, рыхтуе вялікую святочную праграму. У яго рэпертуары — маладзёжныя песні; «Гімн дэмакратычнай моладзі» А. Новікава, «Прывітанне вам, племя маладое» М. Чуркіна і іншыя.

* * *

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна адкрылася вялікая выстаўка літаратуры, прысвечаная 30-годдзю слаўнага юбілею Ленінска-Сталінскага комсамола. Выстаўка мае некалькі раздзелаў.

Першы раздзел ілюструе нараджэнне комсамола і ролю ВКП(б), як арганізатара і кіраўніка комсамола.

Другі раздзел прысвечаны паказу дзейнасці комсамола ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Трэці раздзел расказвае аб гераічнай барацьбе комсамола за выкананне Сталінскіх пяцігодак.

Сярод кніг на выстаўцы: творы В. І. Леніна—«Прамова на III з'ездзе комсамола», І. В. Сталіна—«Аб задачах комсамола», М. І. Калініна—«Аб комуністычным выхаванні і навучанні», а таксама творы совецкіх пісьменнікаў: Н. Астроўскага — «Як гартавалася сталь», А. Фадзеева — «Маладая гвардыя», Б. Гарбатава—«Непакароныя», М. Алігер — «Зоя», Н. Бірукова—«Чайка», П. Броўкі—«Паэма пра Смалячкова» і інш. Апрача таго, выстаўкі літаратуры, прысвечаныя 30-годдзю ВЛКСМ, арганізаваны ў бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, імя Горнага і ў бібліятэцы Дзяржаўнага універсітэта.

* * *

Калектыў мастацкай самадзейнасці клуба імя Ільіча Мінскага чыгуначнага вузла да 30-годдзя ВЛКСМ рыхтуе спецыяльную праграму.

У праграме выступленняў: комсамольскія і маладзёжныя песні гадоў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войн, песні аб Сталіне, аб Маскве і беларускія народныя песні. Драматычны гурток арганізуе свае выступленні на станцыях Негарэлае, Дзяржынск, Фаніпаль і Калодзішчы.

* * *

Адначасова ў двух кінотэатрах Гомеля дэманструецца кінофільм «Маладая гвардыя», які карыстаецца вялікім поспехам у гледачоў. Школы, навучальныя ўстановы, прадпрыемствы горада наладжваюць калектыўныя паходы па прагляду кінокарціны.

Гарадскім камітэтам ВЛКСМ на прадпрыемствах і ўстановах арганізуюцца вечары моладзі, прысвечаныя абмеркаванню кінокарціны «Маладая гвардыя».

ФОТА-АЛЬБОМ ГЕРОЯЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

Да 30-й гадавіны БССР Цэнтральныя мастацка-афармленчыя майстэрні Беларускага аддзялення мастацкага фонда СССР выпусцілі фота-альбом Герояў Соцыялістычнай Працы — майстроў высокіх ураджаяў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Фота-альбом накіраваны ўсім абласным аддзелам культасветустаноў, раённым Дамам культуры і хатам-чытальням рэспублікі.

КЛУБЫ, ХАТЫ-ЧЫТАЛЬНІ, БІБЛІЯТЭКІ— ДА 30-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСІ

Культурна-асветныя ўстановы рэспублікі рыхтуюцца да 30-годдзя Беларускай ССР. Усюды праходзяць агляды мастацкай самадзейнасці. У Магілеўскай вобласці ў раённых аглядах удзельнічала каля 500 гурткоў. Пры раённых Дамах культуры арганізаваны зводныя хоры, якія выступяць са святочнымі канцэртамі.

У Брэсцкай вобласці за месяц прачытана больш 50 лекцый па гісторыі, эканоміцы, культуры і навуцы Беларусі за 30 год, у Бабруйскай вобласці—86 лекцый, у Маладзечанскай—каля 70.

Пры Залескім сельскім Доме культуры, Маладзечанскай вобласці, праведзены літаратурны вечар, у якім удзельнічалі лаўрэат Сталінскай прэміі М. Танк і паэт П. Панчанка. Вечары, прысвечаныя беларускай літаратуры, арганізавала і Гомельская абласная бібліятэка.

Абласныя і раённыя бібліятэкі адправілі ў калгасы і на прадпрыемствы сотні бібліятэк-перасовак са спецыяльна падабранай літаратурай. Ва ўсіх бібліятэках арганізаваны кніжныя выстаўкі, фотамантажы, складзены рэкамендацыйныя спісы «Што чытаць да 30-годдзя БССР».

(БЕЛТА)

Творчыя сувязі беларускіх пісьменнікаў

Умацоўваецца творчая сувязь ленінградскіх і беларускіх пісьменнікаў. Нядаўна ў Ленінградзе выйшла Анталогія беларускай паэзіі ў перакладзе на рускую мову, а таксама зборнік «Белорусские рассказы», памерам 20 друкаваных аркушаў. У кнігу ўвайшлі лепшыя дарэволюцыйныя апавяданні Якуба Коласа, Адвігіна Ш. і З. Бядулі, а таксама апавяданні, прысвечаныя паказу сучаснага жыцця, — К. Чорнага, Э. Самуйлёнка, М. Лынькова, Я. Маўра, М. Клімковіча, А. Стаховіча, М. Паслядовіча, І. Гурскага, П. Пестрака, У. Краўчанкі, Я. Брыля, І. Мележа, А. Якімовіча, П. Кавалёва, І. Грамовіча, М. Луп'сякова, І. Шамякіна і А. Кулакоўскага.

Кніга падрыхтавана групай ленінградскіх пісьменнікаў у сувязі з 30-годдзем БССР. Пераклад апавяданняў на рускую мову ажыццявілі Л. Ракоўскі, В. Раждзественскі, П. Кабзарэўскі, А. Астроўскі, В. Владзіміраў, І. Крат. Апавяданні К. Чорнага дадзены ў перакладзе Е. Мазалькова.

Уступны артыкул для зборніка напісаны М. Клімковічам. У канцы кнігі даюцца бібліяграфічныя даведкі на кожнага беларускага празаіка.

Кніга выдадзена тыражом у 15.000 экземпляраў.

У Мінску выйшла кніга вершаў «Паэты Ленінграда» на беларускай мове. Цяпер рыхтуюцца да выдання «Апавяданні ленінградскіх пісьменнікаў».

Да 30-годдзя БССР ленінградскія пісьменнікі і выдавецтвы рыхтуюць новыя выданні твораў беларускіх пісьменнікаў на рускай мове. Хутка выйдзе кніга беларускіх дзяцей «Ніколі не забудзем», вялікі зборнік беларускай драматургіі, зборнік вершаў Максіма Танка. Рыхтуюцца да выдання аднатомнік вершаў Янкі Купалы, зборнік вершаў Пятра Глебкі, зборнік «Ленінград у беларускай паэзіі» і другі зборнік «Белорусские рассказы». У бібліятэцы паэта пачалася падрыхтоўка да друку зборнікаў вершаў Я. Купалы і Ф. Багушэвіча.

Часопіс «Звязда» ў бліжэйшых нумарах друкуе паэму Петруся Броўкі «Родныя берагі». Ленінградскі радыёкамітэт арганізуе чатыры перадачы, прысвечаныя беларускай совецкай літаратуры.

Узмацняецца творчая сувязь нашых пісьменнікаў з пісьменнікамі братніх Украінскай і Літоўскай рэспублік. У Кіеве выйшла на украінскай мове «Анталогія беларускай паэзіі». Да 30-годдзя БССР выйдзе вялікі зборнік беларускай прозы. Анталогія беларускай літаратуры рыхтуецца і на літоўскай мове.

Саюз пісьменнікаў і Дзяржаўнае выдавецтва БССР намецілі выпусціць на беларускай мове ў 1949 годзе рад твораў украінскіх і літоўскіх пісьменнікаў, а таксама многія творы пісьменнікаў другіх братніх рэспублік.

Кінотэатр у калгасе

У цэнтры калгаса «Прамень соцыялізма» (Мінская вобласць), непадалёку ад прыгожага возера знаходзіцца каменны будынак. Гэта лепшы ў рэспубліцы сельскі кінотэатр «Чырвоны партызан», адкрыты летам мінулага года.

У кінотэатры ёсць вялікая глядзельная заля і файэ, электраэнергія паступае ад сваёй электраўстаноўкі.

Кінотэатр «Чырвоны партызан»—любімае месца адпачынку калгаснікаў. Тут для іх дэманстраваліся фільмы «Трэці ўдар», «Аляксандр Неўскі», «Сказанне аб зямлі Сібірскай», «Радавы Аляксандр Матросаў», «Вызваленне Беларусі» і другія. У сярэднім штомесячна на экране кінотэатра дэманструецца 10—13 кінофільмаў. Для дзяцей праводзяцца спецыяльныя кіносеансы.

Да 30-годдзя БССР будзе арганізаваны фестываль мастацкіх і дакумянтальных фільмаў, прысвечаных Совецкай Беларусі.

Курсы перападрыхтоўкі загадчыкаў хат-чытальняў

У Мінску з 1-га кастрычніка адкрыліся абласныя курсы перападрыхтоўкі загадчыкаў хат-чытальняў. Слухачы курсаў вывучаць біяграфію таварыша Сталіна, праслухаюць рад лекцый па пяцігадоваму плану аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР і БССР, азнаёмяцца з метадамі культурна-асветнай работы ў вёсцы.

Усяго на курсах навучаецца 90 чалавек.

Абласная нарада загадчыкаў раённых аддзелаў культасветустаноў

Гэтымі днямі адбылася нарада загадчыкаў раённых аддзелаў культасветустаноў Мінскай вобласці.

Удзельнікі нарады абмеркавалі пытанні аб правядзенні святкавання слаўнага юбілею Ленінска-Сталінскага комсамола і 30-ай гадавіны БССР, а таксама аб ходзе будаўніцтва сельскіх і калгасных клубаў у абласцях рэспублікі.

50 год Маскоўскага Мастацкага Акадэмічнага тэатра імя Горкага

* * *

МХАТ і беларускае тэатральнае мастацтва

Шмат вялікіх актораў мінулага марылі аб навуцы, якая-б раскрывала сакрэты творчасці, дапамагала выхаванню актора. Гэтую мару здзейсніў К. С. Станіслаўскі. На аснове сваіх асабістых творчых пошукаў, а таксама аналізуючы творчасць выдатных актораў рэалістычнай рускай школы і, у першую чаргу, актораў Малога тэатра, выкарыстоўваючы вопыт Маскоўскага Мастацкага тэатра, Станіслаўскі стварыў сваю сістэму выхавання і работы актора над роллю.

Але няправільна было-б разглядаць яго сістэму як догму, як нешта застыглае. На працягу ўсяго творчага жыцця К. С. Станіслаўскага асноўныя палажэнні яго сістэмы ўдасканальваліся і неаднаразова мяняліся. Гэта асабліва можна заўважыць, калі параўнаць канцэпцыі самога Станіслаўскага ў дарэволюцыйны перыяд і ў паслякастрычніцкі перыяд. Але ад галоўнага шляху — рэалістычнага мастацтва—Станіслаўскі ніколі не адыходзіў.

У барацьбе за рэалістычнае мастацтва, у барацьбе з акторскім кансерватызмам і штампамі, з эстэцтвам і фармалізмам складалася сістэма Станіслаўскага, на творчых прынцыпах якой развіваліся традыцыі рэалістычнага мастацтва.

Аб жыццёвасці сістэмы Станіслаўскага сведчыць гарачая любоў совецкага гледача да спяктакляў МХАТ'а, бо рэалістычны творчы метад яго блізкі нашаму народу, і гэты метад стаў асновай выхавання і творчасці актораў совецкага тэатра.

Вось што гаворыць аб сваёй сістэме сам Станіслаўскі: «Тое, што я пішу ў сваёй кнізе, адносіцца не да асобнай эпохі і яе людзей, а да арганічнай прыроды ўсіх людзей артыстычнага складу, усіх нацыянальнасцей і ўсіх эпох».

Сістэма Станіслаўскага, гэта — сістэма перажывання. Станіслаўскі крок за крокам раскрывае метад падрыхтоўкі актора да такога стану творчасці, каб жыць на сцэне думкамі і пачуццямі вобраза.

Але няправільна было-б думаць, што дастаткова вывучыць сістэму, каб можна было іграць на сцэне. Сістэма паказвае шляхі, па якіх таленавіты актор у штодзённай працы над сабой можа падняцца да высокага ўзроўню сцэнічнага майстэрства.

Вялікі ўплыў робіць Маскоўскі Мастацкі тэатр на ўвесь совецкі тэатр і, у прыватнасці, на тэатральнае мастацтва Беларусі.

Шчыльная творчая сувязь беларускага тэатра з МХАТ'ам пачалася амаль з першых дзён заснавання прафесіянальнага беларускага совецкага тэатра. У свой час тэатральная моладзь беларускага тэатра паставіла перад Наркамасветы БССР пытанне аб навучанні акторскаму майстэрству ў Маскве. І ўвосень 1921 года маладыя акторы тэатра (А. Ільінскі, Е. Саннікаў, М. Міцкевіч, С. Станюта, Я. Глебаўская), а таксама моладзь з самадзейнасці (Т. Бандарчык, В. Галаўчынер і інш.) былі накіраваны ў Маскву ў беларускую тэатральную студыю, арганізаваную пры першай студыі МХАТ'а.

Мастацкім кіраўніком студыі спачатку быў А. Бондараў, пасля ўвесь час кіраваў ёю актор і рэжысёр першай студыі МХАТ'а В. С. Смышляеў.

Апрача В. Смышляева майстэрства актора выкладалі Б. Афонін, А. Гейрот і В. Громаў. Мастацкае слова выкладала С. Гіацынтава.

Заняткі адбываліся ў памяшканні першай студыі МХАТ'а, што дало магчымасць беларускім студыйцам сустракацца з такімі акторамі, як Е. Вахтангаў, А. Дзікі, А. Чабан, Бярсенеў, Дурасава і інш. Творчая атмасфера, якая панавала ў студыі МХАТ'а, мела вялікае выхаваўчае значэнне для будучага тэатральнага каляктыва.

У 1922 годзе студыя рэарганізуецца ў Беларускі тэатральны інстытут у Маскве. У склад студэнтаў інстытута ўвайшлі А. Ільінскі, П. Малчанаў, Ц. Сяргейчык, С. Скальскі, Л. Шынко, М. Бялінская, М. Сянько, Я. Радзялоўская, З. Вялікі і інш.

Ствараецца яўрэйская тэатральная секцыя, у якую ўваходзяць Л. Літвінаў, М. Моін, П. Вольшіна, М. Альтман, В. Галаўчынер, Э. Дрэйзіна, А. Трэпель, М. Рывін і некаторыя іншыя.

Вялікім выхаваўчым фактарам была сама Масква з шматлікімі літаратурнымі і тэатральнымі дыспутамі. Была поўная магчымасць праглядаць усе пастаноўкі Маскоўскага Мастацкага тэатра і яго студыі, вывучаць ігру вялікіх майстроў сцэны, рабіць абмеркаванні спяктакляў, весці гарачыя творчыя спрэчкі. А спрэчкі разгараліся палымяныя, бо ў той час у тэатральным мастацтве Масквы было шмат творчых напрамкаў, у якіх трэба было дасканала разабрацца. Але студэнты Беларускага тэатральнага інстытута заставаліся вернымі метаду МХАТ'а.

Пасля сканчэння інстытута з яго выпускнікоў быў арганізаваны Другі Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр (зараз тэатр імя Я. Коласа). З таго часу сувязь з МХАТ'ам не парывалася. У новым тэатры некаторы час працуе мастацкім кіраўніком рэжысёр першай студыі МХАТ'а С. Хачатураў. Сувязь Другога Беларускага тэатра з творчымі работнікамі МХАТ'а падтрымлівалася і ў наступныя гады.

У 1934 годзе Беларускі тэатр юнага гледача выязджае ў Ленінград, дзе павышае кваліфікацыю акторскага майстэрства пад кіраўніцтвам Б. Сушкевіча—рэжысёра і актора МХАТ—II.

У 1935 годзе ў Маскву выязджае Трэці Беларускі тэатр, які таксама займаецца там павышэннем акторскай кваліфікацыі пад кіраўніцтвам рэжысёраў МХАТ'а А. Дзікага і І. Раеўскага.

Шчыльная сувязь тэатра імя Янкі Купалы з МХАТ'ам пачынаецца з падрыхтоўкі да дэкады Беларускага тэатра ў Маскве, калі сталым кансультантам запрашаецца рэжысёр МХАТ'а І. Раеўскі, які разам з Л. Рахленкам ставіць п'есу К. Крапівы «Хто смяецца апошні» і кансультуе ўсе дэкадныя пастаноўкі.

Акрамя таго, на Беларусі працуюць два каляктывы, якія выхаваны вялікімі майстрамі МХАТ'а А. Тарханавым і Л. Леанідавым (Магілеўскі драматычны тэатр і тэатр імя Ленінскага комсамола ў Брэсце).

Так, пад уплывам перадавога рускага совецкага тэатра развіваецца і расце беларускае тэатральнае мастацтва.

Апошнія гастролі тэатра імя Янкі Купалы ў Маскве, якія з'явіліся творчым рапартам тэатра сталіцы нашай Радзімы, сведчаць аб тым, што старэйшы беларускі тэатр варты свайго настаўніка—Маскоўскага Акадэмічнага тэатра.

К. САННІКАЎ,
заслужаны артыст рэспублікі, лаўрэат Сталінскай прэміі.

Будынак МХАТ у праездзе Мастацкага тэатра.
Фота Г. Шырокава (ТАСС).

Найлепшы ў свеце

Маскоўскі Мастацкі тэатр СССР імя Горкага заслужана лічыцца лепшым тэатрам у свеце. Няма патрэбы даводзіць, які плённы ўплыў ён зрабіў на рост і развіццё совецкай сцэнічнай культуры, зацвердзіўшы соцыялістычны рэалізм як творчы метад у тэатральным мастацтве.

Калі звярнуцца да гісторыі ўзнікнення тэатра імя Янкі Купалы, то іменна дзякуючы таму, што перад намі было велізарнае багацце і слаўныя традыцыі роднага нам рускага тэатра, у тым ліку МХАТ'а, Малога тэатра і раду іншых, мы змаглі шпарка расці і развівацца, следуючы сцэнічным прынцыпам такіх выдатных майстроў і тэарэтыкаў тэатра, якімі былі К. С. Станіслаўскі і В. І. Неміровіч-Данчанка.

Перамога Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі адкрыла нам дарогу ў мастацтва, дала магчымасць знаёміцца і вывучаць лепшыя спяктаклі і ролі совецкага рэпертуара і класікі.

Праваднікам і паслядоўцам соцыялістычнага рэалізма ў нашым тэатры быў першы мастацкі кіраўнік і рэжысёр, зараз народны артыст рэспублікі Е. А. Міровіч. У сваёй практычнай дзейнасці Е. А. Міровіч заўсёды імкнуўся перадаць нам свой вопыт, свае веды, выхоўваў нас на лепшых традыцыях рускага тэатральнага мастацтва.

Амаль з першых год нашай тэатральнай дзейнасці ў каляктыве тэатра з'яўляецца выключная цікавасць да працы і творчасці МХАТ'а. Вялікая праўда жыцця, адлюстраваная ў кожным спяктаклі МХАТ'а, глыбіня думкі і высокая прастата акторскага выканання, дасканалая пранікнёнасць у кожны вобраз, тонкае майстэрства ў адшліфоўцы кожнай трапна знойдзенай і тыповай дэталі, стройная кампазіцыя ўсяго спяктакля ў цэлым, — вось далёка не поўны пералік сцэнічных якасцяў спяктакляў МХАТ'а. Усё тое, што давялося бачыць у МХАТ, заўсёды глыбока хвалявала мяне і захапляла, напаўняла пачуццём адказнасці за сваю акторскую працу. Мы заўсёды ўваходзілі ў МХАТ, як у вялікую акадэмію мастацтва. Творчасць такіх выдатных майстроў, як Качалаў, Хмялёў, Масквін, Тарасава, Тарханаў, Кніпер-Чэхава, Кедраў, Грыбаў, Яланская і іншыя, выключнае пачуццё ансамбля ва ўсім каляктыве мхатаўцаў—усё гэта ўспрымалася намі, як высокі ўзор сцэнічнай культуры і майстэрства.

Спяктаклі МХАТ'а, яго строгі рэалістычны метад дапамагалі нам пераадольваць недахопы, натуралістычныя і фармалістычныя памылкі, якія часам здараліся ў нашых спяктаклях. Выходзячы з творчых прынцыпаў МХАТ'а, нам удалося стварыць такія спяктаклі, як «Апошнія» М. Горкага, «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, высокая ідэйнасць і мастацкая праўда якіх атрымалі агульнае прызнанне.

Спяктакль «Апошнія», пастаўлены рэжысёрам М. Зоравым, кансультаваўся рэжысёрам МХАТ'а І. Раеўскім, і гэтая практычная творчая сувязь прынесла нам, акторам, вялікую карысць. Мы і сёння прадаўжаем нашу дружбу з І. Раеўскім і праз яго з каляктывам Маскоўскага Мастацкага тэатра. Работа з Раеўскім, які вельмі сур'ёзна ставіцца да сваёй справы, дапамагла нам глыбей пазнаць і на практыцы адчуць геніяльную мудрасць і навуковую каштоўнасць сістэмы Станіслаўскага, і мы адчулі, што гэта і наш творчы шлях, што і мы дасягнем добрых вынікаў, калі будзем ісці па ім.

Цяжка нават выказаць у словах, якую вялікую радасць мы адчулі і якой удзячнасцю напоўніліся нашы сэрцы, калі мы ў гэтым годзе выступалі на сцэне лепшага тэатра ў свеце і калі наша выступленне было ацэнена і самімі мхатаўцамі, і ўсёй тэатральнай грамадскасцю Масквы, як мастацкі каштоўнае, блізкае па сваіх творчых прынцыпах да работы МХАТ'а.

50-годдзе лепшага ў свеце совецкага тэатра—свята ўсяго нашага народа, усіх тэатральных работнікаў Совецкага Саюза. Мы з поўнай падставай лічым сябе вучнямі і паслядоўнікамі МХАТ'а, а таму з асаблівай радасцю і пашанай будзем святкаваць яго юбілей.

З усёй шчырасцю пажадаем юбіляру яшчэ больш творчых поспехаў і славы на карысць нашага совецкага мастацтва і нашай Радзімы.

І. ЖДАНОВІЧ,
народная артыстка БССР, лаўрэат Сталінскай прэміі.

Музей тэатра

Побач з будынкам Маскоўскага Мастацкага Акадэмічнага тэатра імя Горкага размешчаны музей МХАТ. Экспанаты музея паказваюць творчую і тэарэтычную спадчыну МХАТ за яго 50-гадовае існаванне.

На здымку: дырэктар музея пісьменнік Н. Д. Целяшаў (злева) паказвае экспанаты музея групе наведвальнікаў.
Фота З. Еўзерыхіна (ТАСС).

Тут мы сустракаем матэрыялы аб жыцці і творчасці двух заснавальнікаў тэатра—К. С. Станіслаўскага і В. І. Неміровіча-Данчанкі, фотаздымкі, перапіску з прадстаўнікамі перадавога рускага мастацтва тых год, макеты пастановак, афішы першых спяктакляў, газеты і інш.

1898 год. Створаны мастацкі тэатр. Фотаздымкі першага склада артыстаў. Тут цяпер шырока-вядомыя совецкаму гледачу, але тады зусім юныя: О. Л. Кніпер-Чэхава, І. М. Масквін, М. П. Ліліна, В. В. Лужскі.

Мастацкі тэатр ставіць п'есу А. К. Талстога «Цар Фёдар Іаанавіч».

В. І. Неміровіч-Данчанка піша Станіслаўскаму: «Гэта якраз тая п'еса, па якой мы можам і павінны зліцца разам. Гэта або наша самая вялікая заслуга, або наша бясслаўе».

«Цар Фёдар Іаанавіч» прыносіць тэатру славу і вылучае маладога І. М. Масквіна, як выканаўцу, як аднаго з карыфеяў рускай сцэны.

У 1898 годзе тэатр ставіць «Чайку» Чэхава, а ў 1900 годзе ўвесь каляктыў прыязджае ў Ялту, дзе ў той час жыў пісьменнік.

Аб велізарных узаемаўплывах драматурга і тэатра сведчаць шматлікія фотаздымкі, артыкулы, рэцэнзіі, афішы і іншыя музейныя матэрыялы, размешчаныя на стэндах.

Тэатр ажыццяўляе пастаноўкі п'ес «Тры сястры», «Вішнёвы сад», «Іваноў». Тэатр любіць Чэхава, і не выпадкова Неміровіч-Данчанка заўважае: «Эмблема чайкі на нашай заслоне сімвалізуе для нас наш творчы пачатак, нашу ўлюбёнасць у Чэхава, яго велізарную ролю ў МХАТ».

У 1902 годзе тэатр звярнуў увагу на творчасць Горкага, чый магутны голас палымянага рэволюцыянера быў пачуты Мастацкім тэатрам і яго кіраўнікамі. Пастаноўкі «На дне» і «Мяшчане» далі права К. С. Станіслаўскаму сцвярджаць, што «галоўным пачынальнікам і стваральнікам грамадска-палітычнай лініі ў нашым тэатры быў Горкі».

Музей МХАТ карыстаецца заслужанай любоўю масквічоў. Яго наведваюць сотні дзеячоў совецкага мастацтва з розных гарадоў нашай Радзімы, нашы прыяцелі; яны пакідаюць у кнізе водгукаў свае пажаданні і думкі. Вось некаторыя з іх:

«Архіў і музей Мастацкага тэатра надзвычай добра дапаўняюць той дар культуры, не толькі рускай, але і сусветнай, які робіць тэатр».

П. Піксанаў, М. Цяўлоўскі.

«Я стаў лепш адносіцца да сучаснага тэатра толькі ад таго, што я пабываў тут».

Джон Б. Прыстлі.

«Прыемна і радасна бачыць, што рускі народ мае такое выдатнае мастацтва»,—запісалі дэлегаты мастацтва адной замежнай дзяржавы.

У кнізе водгукаў падобных выказванняў шмат.

Музей МХАТ імя Горкага—яскравая старонка гісторыі рускага і сусветнага мастацтва, яго бліскучы летапіс.

(Наш. кар.).

* * *

Выдатная школа сцэнічнага майстэрства

Мне часта здаецца, што МХАТ, — гэта не назва вялікага мастацкага і складанага арганізма, а імя любімага, роднага, інтымна-блізкага чалавека.

Я люблю мастацтва гэтага цудоўнейшага тэатра за тое, што яно глыбока-чалавечнае, высокаідэйнае, жыццёва-праўдзівае.

Я заўсёды ад усяго сэрца ўдзячны тэатральнаму каляктыву за тое, што там акторы не «іграюць» і не «прадстаўляюць», а жывуць складаным творчым натхнёным жыццём і дамагаюцца такога майстэрства, што гэтая складанасць здаецца надзвычай простай і натуральнай.

Выдатная школа сцэнічнага рэалізма Мастацкага тэатра мае тысячы вучняў і паслядоўнікаў ва ўсім свеце.

Уплыў гэтай школы на многанацыянальную совецкую тэатральную культуру народаў нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны выключна вялікі і плённы.

Нацыянальныя тэатры, захоўваючы ўсе асаблівасці сваёй творчасці, раслі і мастацкі ўзбагачаліся пад жыватворчым уплывам сістэмы Станіслаўскага.

Гэта ў поўнай меры адносіцца да нашага старэйшага беларускага тэатра імя Янкі Купалы. Я не памылюся, калі скажу, што лепшыя спяктаклі нашага тэатра, лепшыя вобразы, створаныя за ўсе гады яго жыцця, спяктаклі, якія заваявалі любоў і прызнанне гледача сваёй высокай ідэйнасцю, жыццёвай праўдай, мастацкай прастатой і адзінствам ансамбля, — усе гэтыя спяктаклі і вобразы звязаны з глыбокім і добратворным уплывам рэалістычнай школы Мастацкага тэатра.

Вось ужо дваццаць год, як я працую ў тэатры імя Янкі Купалы. За гэтыя гады я паставіў многа спяктакляў, сыграў не мала роляў. Былі ўдачы і зрывы, творчыя радасці і горычы, але я шчаслівы тым, што ў меру маіх сціплых сіл і здольнасцяў я, разам з маімі таварышамі па працы, імкнуўся сцвярджаць у нашай творчасці высокія прынцыпы школы Мастацкага тэатра.

Наш тэатр у свой час перажываў цяжкія моманты. Яго спрабавалі скіраваць на шлях безыдэйных, фармалістычных выкрутасаў, ілжывага, хадульнага рамантычнага пафасу. У барацьбе з гэтымі варожымі ўплывамі каляктыву тэатра дапамагала вялікае рэалістычнае мастацтва МХАТ'а.

Увесь велізарны творчы вопыт Мастацкага тэатра—гэта неацанімы ўклад у справу барацьбы совецкага тэатра за метад соцыялістычнага рэалізма, за сапраўдную народнасць нашага совецкага тэатральнага мастацтва.

Л. РАХЛЕНКА,
народны артыст БССР.

НАШ НАСТАЎНІК

Творчая біяграфія Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа — яскравы прыклад велізарнага ўплыву Мастацкага Акадэмічнага тэатра на рост і развіццё тэатральнага мастацтва нацыянальных рэспублік.

У 1922 годзе з Беларусі ў Маскву была паслана група таленавітай моладзі для вучобы ў тэатральнай студыі.

Першымі выкладчыкамі студыі былі майстры Мастацкага Акадэмічнага тэатра. Ужо з першых дзён вучобы студыйцы далучыліся да культуры перадавога рускага тэатра, пачалі вучыцца глыбокаму раскрыццю рэчаіснасці метадам рэалістычнага мастацтва. Яны старанна вывучалі вопыт і традыцыі старэйшага рускага тэатра. Але самай плённай школай былі спяктаклі тэатра. Студыйцы глядзелі і вывучалі спяктаклі, пастаўленыя К. С. Станіслаўскім і В. І. Неміровічам-Данчанкам, спяктаклі з удзелам Масквіна, Тарханава, Кніпер-Чэхавай, Леанідава, Качалава і інш.

Да апошняга дня вучобы студыйцы знаходзіліся пад жыватворчым уплывам Мастацкага Акадэмічнага тэатра.

У Беларусь студыя вярнулася з палымяным жаданнем ажыццявіць на беларускай сцэне творчыя запаветы і прынцыпы сваіх настаўнікаў, ствараць вобразы з сучаснасці.

Школа Мастацкага Акадэмічнага тэатра выхавала ў маладых актораў і рэжысёраў своеасаблівы імунітэт супроць ваяўнічага нацыяналізма, які імкнуўся ў той час заняць камандныя пазіцыі і ў тэатральным мастацтве БССР.

Жадаючы паказаць праўду жыцця, малады тагачасны тэатр звярнуўся да лепшых узораў совецкай драматургіі, якія давалі акторам магчымасць ствараць рэалістычныя мастацкія вобразы нашага часу. У рэпертуар тэатра ўключаецца п'еса Б. Лаўрэнёва «Разлом». Велізарны поспех гэтага спяктакля паказаў маладому тэатру, наколькі плённым быў уплыў школы Мастацкага Акадэмічнага тэатра, па творчых традыцыях якога быў пастаўлены спяктакль «Разлом».

Пасля «Разлома» тэатр пачынае сістэматычна працаваць над лепшымі п'есамі, якія раскрывалі хвалюючыя тэмы свайго часу. «Байцы» Б. Рамашова, «Вайна вайне» і «У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка, «Над Бярозай-ракой» П. Глебкі, «Ірышка» К. Чорнага, нарэшце — «Чалавек з ружжом» і «Крэмлёўскія куранты» Н. Пагодзіна — вось той рэпертуар, на якім тэатр засвойваў творчыя прынцыпы Мастацкага Акадэмічнага тэатра, замацоўваў пазіцыі рэалістычнага мастацтва.

І да нашых дзён тэатр імя Я. Коласа застаўся верны запаветам сваіх настаўнікаў. У сваёй штодзённай творчай працы ён кіруецца традыцыямі лепшага ў свеце тэатра.

Выхаванцамі майстроў Мастацкага Акадэмічнага тэатра былі акторы і рэжысёры М. Міцкевіч, П. Малчанаў, Л. Мазалеўская, Ц. Сяргейчык, А. Ільінскі, Я. Радзялоўская, А. Шэлег і іншыя. Яны ў сваю чаргу перадаюць зараз свяшчэнныя традыцыі сваіх настаўнікаў маладому пакаленню актораў.

І. ДОРСКІ.

Тэатр, любімы народам

Яшчэ ў юнацтве я вельмі цікавіўся Маскоўскім Мастацкім Акадэмічным тэатрам. Мяне асабліва захапляла творчасць славутых тэатральных дзеячоў, заснавальнікаў гэтага цудоўнага мастацкага каляктыва—К. С. Станіслаўскага і В. І. Неміровіча-Данчанкі і выдатнага артыста В. І. Качалава, майстэрства якога мяне вабіла сваёй глыбінёй і выключнай мастацкай дасканаласцю.

Маскоўскі Мастацкі тэатр з'яўляецца любімым тэатрам совецкага народа, які здабыў гэтую любоў за сваю даходлівасць, зразумеласць, пранікнёнасць, выключную рэалістычную праўдзівасць.

Калі я стаў акторам, дык сам адчуў, наколькі важна нам быць знаёмымі з творчым метадам мхатаўцаў.

Наш беларускі тэатр заўсёды ў сваёй творчасці ішоў па шляху рэалізма, што, безумоўна, і збліжала нас з рэалістычнай школай Маскоўскага Мастацкага тэатра. Асабліва блізка мы гэта адчулі тады, калі пачалі працаваць над п'есамі Максіма Горкага, таго аўтара, імя якога носіць слаўны рускі тэатр.

Я з вялікім энтузіязмам працаваў над роллю Каламійцава ў спяктаклі «Апошнія» М. Горкага. Гэтую пастаноўку здзейсніў адзін з таленавітых беларускіх рэжысёраў М. Зораў, які ў супрацоўніцтве з мхатаўскім рэжысёрам І. М. Раеўскім ставіў яго ў нашым тэатры. У працэсе работы над гэтым спяктаклем мне давялося найбольш блізка пазнаёміцца з сістэмай Станіслаўскага і на практыцы адчуць яе плённы ўплыў на творчы працэс.

Для нас, беларускіх актораў, мастацтва Акадэмічнага тэатра асабліва блізкае. Яшчэ ў пачатку заснавання аднаго з дзяржаўных беларускіх тэатраў (імя Якуба Коласа) артысты яго вучыліся ў тэатральнай студыі пад кіраўніцтвам вядомых артыстаў мхатаўскай школы.

Мы заўсёды вучыліся ў майстроў Маскоўскага Мастацкага тэатра — Масквіна, Тарханава, Леанідава, Хмялёва і інш.

Майстры гэтага выдатнага тэатра ў час дэкады беларускага мастацтва ў Маскве асабліва вялікую ўвагу звярнулі на наш каляктыў. Яны не толькі высока ацанілі горкаўскі спяктакль «Апошнія», але зрабілі значны ўплыў на далейшую творчую працу нашага каляктыва.

На нашу долю ў гэтым годзе выпала шчасце выступаць на сцэне Маскоўскага Мастацкага тэатра, дзе мы былі з радасцю сустрэты акторамі гэтага тэатра і патрабавальным маскоўскім гледачом. Гэта было сведчанне вялікай дружбы выдатнага рускага тэатра з артыстамі старэйшага беларускага каляктыва. Для нас гэта былі знамянальныя гастролі, таму што мы рапартавалі сталіцы нашай Радзімы аб дасягненнях культуры сваёй рэспублікі, якая сёлета святкуе 30-годдзе. Мы зноў пачулі цёплыя словы ацэнкі ад любімых мхатаўскіх актораў, творчая дружба з якімі ў нас штогод расце і мацнее.

У дзень 40-годдзя Маскоўскага Мастацкага Акадэмічнага тэатра я асабіста меў гонар ад імя беларускага народа вітаць выдатных майстроў цудоўнага рускага тэатра В. І. Неміровіча-Данчанку, а таксама артыстаў Масквіна, Качалава, Хмялёва і інш.

І вось цяпер, у дзень слаўнага 50-годдзя Маскоўскага Мастацкага тэатра, я вітаю выдатных рускіх совецкіх артыстаў і жадаю ім доўгіх год плённай творчай працы на карысць соцыялістычнага мастацтва.

У. УЛАДАМІРСКІ,
народны артыст БССР.

ДАКЛАДЫ І ГУТАРКІ

16 кастрычніка ў памяшканні Дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы адбыўся ўрачысты сход тэатральнай грамадскасці г. Мінска разам з працоўнымі мінскіх прадпрыемстваў, прысвечаны 50-годдзю МХАТ.

З дакладам аб 50-гадовым творчым шляху тэатра выступіў прадстаўнік ВТА і Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў СССР Ю. Оснас. Пасля ўдзельнікам быў паказаны спяктакль «Апошнія» М. Горкага.

* * *

Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР адзначае юбілей МХАТ творчай навуковай канфярэнцыяй, якая адбудзецца 25 кастрычніка ў памяшканні Кансерваторыі г. Мінска. На канфярэнцыі будуць заслуханы даклады: «Уплыў МХАТ'а на беларускае тэатральнае мастацтва», «Аб творчым метадзе Мастацкага тэатра» і іншыя. На канфярэнцыю запрошаны прадстаўнікі ўсіх тэатраў рэспублікі.

На прадпрыемствах і навучальных установах будуць праведзены даклады, гутаркі і лекцыі аб слаўным 50-годдзі МХАТ.

Рэспубліканскі Дом народнай творчасці праводзіць гутаркі і вечары, прысвечаныя 50-годдзю МХАТ.

* * *

Сцэна з чацвертай дзеі п'есы В. Ф. Чырскова «Пераможцы»—у штабе фронта.
(Фотахроніка ТАСС).

А. ЕСАКОЎ

ВЫДАТНЫ ТЭАТРАЛЬНЫ ДЗЕЯЧ

(70 год з дня нараджэння і 50 год сцэнічнай дзейнасці народнага артыста БССР Е. А. МІРОВІЧА)

Міровіч выхоўваўся як актор і рэжысёр па лепшых традыцыях рускай рэалістычнай школы выдатных майстроў Александрынскага тэатра. У совецкія гады ён паслядоўна прытрымліваўся напрамку Маскоўскага Мастацкага тэатра, творчай сістэмы Станіслаўскага.

... Еўсцігней Афінагенавіч Міровіч (Дунаеў) нарадзіўся 18 жніўня 1878 года ў Пецярбургу. Тут ён скончыў рэальнае вучылішча і «пайшоў на свой хлеб» — служыць на пошту ў якасці канторскага работніка.

У 18 год Міровіч паступае вучыцца на Пецярбургскія двухгадовыя тэатральныя курсы імя Волкава. На другім годзе навучання педагог курсаў па майстэрству актора П. Шэін ужо развучваў з ім асобныя ролі і ўводзіў яго ў спяктаклі ансамбля Александрынскага тэатра. Гэта быў па сутнасці вандроўны каляктыў, які выступаў у рабочых і салдацкіх клубах. У ім прымалі ўдзел і выдатныя майстры рускага рэалістычнага тэатральнага мастацтва: К. Варламаў, В. Давыдаў, В. Стрэльская.

Малады актор выконваў тады ролі правінцыяльнага служачага ў спяктаклі «Хрушчоўскія абшарнікі», маладога чалавека ў п'есе «Цецярукам не лётаць па дрэвах» (у гэтым спяктаклі іграў і К. Варламаў), Белагубава — у «Прыбытковым месцы», Даніэля — у «Разбойніках», дробнага чыноўніка Дзявяткіна — у «Казённай кватэры». Выкананне гэтых роляў пасля сканчэння курсаў зрабіла яго імя больш-менш вядомым. Аднак, у Адміралтэйскі тэатр Міровіча прынялі толькі на другарадныя ролі.

У Екацярынінскім тэатры, побач з трэпеступеннымі п'есамі Пацехіна, Патапенкі, Шпажынскага, Южына (Сумбатава), Рыжкова, Віктара Крылова, Міровічу давялося сустрэцца і з п'есамі М. Горкага. У спяктаклі «На дне» ён іграў Бубнова, у «Васе Жалязновай» (першы варыянт) — старэйшага сына.

Потым Міровіч пераходзіць у Троіцкі, а затым у Інтымны тэатр, якім кіравалі рэжысёры і артысты Александрынскага тэатра Унгерн і Ю. Азароўскі. Інтымны тэатр з'яўляўся тэатрам мініятур. Міровічу даводзілася ў ім іграць характэрныя ролі. Вядомы тэатральны крытык Кугель асабліва высока ацэньваў камядыйныя ролі маладога артыста, якія сапраўды выконваліся ім па-майстэрску.

У 1912 годзе ў летніх тэатрах Стрэльні і Арыенбаума (пад Пецярбургам) пачынаецца рэжысёрская дзейнасць Міровіча. Ён ставіць спяктаклі «Падарожнікі» Рыжкова і «Здрадніцтва» А. Южына (Сумбатава).

У перыяд Лютаўскай рэволюцыі 1917 года Е. Міровіч працуе ў Ліцейным тэатры, які належаў не прыватнаму антрэпрэнёру, а таварыству актораў. У гэты момант грамадская дзейнасць Еўсцігнея Афінагенавіча асабліва ўзмацняецца. Ён выступае ў часопісу «Агляд тэатраў» з артыкулам супроць Суворынскага тэатра, дзе яшчэ існавала эксплаатацыя актораў.

Грамадскія матывы найбольш поўна выявіліся ў Е. Міровіча ў яго літаратурнай творчасці.

Першая п'еса Міровіча, пастаўленая ў тэатры, гэта — «Графіня Эльвіра» — шарж на салдацкі спяктакль. У сатыры па купецкія тэатры («Тэатр купца Япішкіна»), якіх нямала было тады ў Пецярбургу і іншых гарадах Расіі, высмейваліся дробныя гандляры, што хацелі ператварыць тэатр у сродак здабычы грошай. У гэтых двух камедыях драматург уздымаў пытанне аб выхаваўчай ролі тэатра, які павінен жыць ідэямі народа. Таму апошнюю сваю дарэволюцыйную камедыю — «Вова прыстасаваўся» — ён прысвяціў барацьбе з мяшчанствам.

У 1919 годзе з гастрольнай групай артыстаў Ліцейнага і Інтымнага тэатраў, па камандыроўцы Галоўпалітасветы за подпісам Луначарскага, Е. Міровіч прыязджае ў Беларусь. Акторы наведалі Віцебск і Гомель. Неўзабаве Чырвоная Армія вызваліла Мінск, і ў ім пачаў засноўвацца совецкі тэатр. Рускую трупу было даручана арганізаваць Міровічу. Але паколькі і рускі, і беларускі, і яўрэйскі тэатры знаходзіліся ў адным памяшканні, дык спачатку Міровічу даводзілася працаваць у рускім тэатры і дапамагаць беларускаму. Поспех спяктакля «Раскіданае гняздо» Я. Купалы і гарачы энтузіязм маладых артыстаў натхнілі рэжысёра Е. Міровіча на тое, каб паспрабаваць здзейсніць пастаноўку вядомай горкаўскай п'есы «На дне».

Е. Міровіч хутка зрадніўся з каляктывам, з якім знайшоў агульную мову.

У пачатку сваёй працы ў Першым Беларускім Дзяржаўным тэатры (цяпер тэатр імя Янкі Купалы) Міровіч паставіў за мэту паказаць фальклорныя багацці беларускага народа. У гэты перыяд былі ажыццёўлены такія спяктаклі, як «На Купалле», «Вяселле», «Машэка», «Каваль-Ваявода». Спяктаклі «На Купалле» і «Машэка» атрымалі высокую ацэнку ў Маскве, дзе яны былі паказаны ў 1923 годзе на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Е. Міровіч як аўтар «Машэкі», «Каваля-Ваяводы» і як пастаноўшчык адчуў, што аднаго этнаграфічнага багацця недастаткова для раскрыцця духоўнага аблічча беларускага народа. Неабходна спыніць увагу, перш за ўсё, на соцыяльных з'явах, на паказе класавай барацьбы, якую, дарэчы, увесь час імкнуліся затушаваць ворагі народа— беларускія буржуазныя нацыяналісты.

Чым больш умацоўвалася совецкая дзяржава, тым больш шалелі яе ворагі і ўзмацнялася класавая барацьба ў краіне. Е. Міровіч піша п'есы пра аднаўленне прамысловасці ў Беларусі—«Перамога» і «Запяюць верацёны». Буржуазным нацыяналістам не вельмі падабаліся гэтыя творы. Не гледзячы на рад недахопаў—шматтэмнасць, празмерная публіцыстычнасць, што рабіла іх падобнымі да п'ес-аглядаў на вострыя палітычныя тэмы,—творы гэтыя ўсё-ж адыгралі сваю станоўчую ролю, таму што ў беларускай драматургіі яны паказвалі вобразы рабочых, комуністаў, совецкую інтэлігенцыю — новыя вобразы людзей, народжаных рэволюцыяй.

Пазней, калі ў тэатры былі пастаўлены такія рэволюцыйныя спяктаклі, як «Мяцеж», паводле рамана Д. Фурманава, і «Бронецягнік 14—69» Ус. Іванова, дзе праўдзіва адлюстравана барацьба нашага народа за совецкую ўладу, буржуазныя нацыяналісты настойвалі на тым, каб названыя спяктаклі зняць з рэпертуара. Але ім гэта не ўдалося. Партыя і совецкая грамадскасць рашуча закляймілі варожую вылазку і падтрымалі тэатр у яго барацьбе за сучасны рэпертуар.

Міровіч імкнецца прыцягнуць да работы над п'есамі маладых пісьменнікаў, якім сам асабіста дапамагае. У рэпертуары тэатра з'яўляюцца такія спяктаклі, як «Мост» Я. Рамановіча, «Гута» Р. Кобеца і інш. Гэтыя п'есы былі каштоўныя тым, што яны шырока паказвалі соцыяльныя змены, якія адбываліся ў нашай краіне.

Е. Міровічам створана цэлая галярэя цудоўных спяктакляў, якія надоўга ўвайшлі ў скарбніцу беларускай тэатральнай культуры і зрабіліся ўжо цяпер яго слаўнай гісторыяй. Ім выхавана цэлая плеяда выдатных майстроў сцэнічнага совецкага мастацтва, якія вядомы далёка за межамі рэспублікі. Мы маем на ўвазе такога славутага артыста, як У. Крыловіч, а таксама артыстаў Г. Глебава, Б. Платонава, У. Уладамірскага, Г. Грыгоніса, І. Ждановіч, К. Саннікава, Л. Ржэцкую, М. Зорава, В. Галіну, Л. Рахленку і інш.

З 1931 года Міровіч пераходзіць на педагагічную працу. У Гомелі ім былі створаны курсы-студыя, з якіх вырас Гомельскі тэатр Рабочай Моладзі, а пазней і Дзяржаўны вандроўны калгасна-соўгаспы тэатр. Потым Еўсцігней Афінагенавіч пераходзіць у малады каляктыў Дзяржаўнага тэатра юнага гледача БССР, дзе ставіць палітычна-надзённыя спяктаклі—«Як гартавалася сталь» (інсцэніроўка М. Юдалевіча паводле аднайменнага рамана пісьменніка Н. Астроўскага), «Гады выпрабавання» К. Раймонд і «Ноч у верасні» І. Чэкіна. Перад вайной Міровіч пачынае выкладаць у тэатральным вучылішчы, а пасля Вялікай Айчыннай вайны прызначаецца намеснікам дырэктара па навучальнай частцы Беларускага Дзяржаўнага Тэатральнага Інстытута, дзе атрымоўвае званне прафесара.

Партыя і ўрад высока ацанілі творчую дзейнасць Е. А. Міровіча, узнагародзіўшы яго двойчы ордэнамі — Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Почёта» і надаўшы яму годнасць народнага артыста БССР.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

Дзіўныя прапановы тав. Ігнатовіча

У нашай газеце ў № 35 быў змешчаны артыкул «Шырэй распаўсюджваць часопісы і газеты», у якім падвяргалася крытыцы работа рэспубліканскага аддзела «Саюздруку» за маруднае і недастатковае распаўсюджванне перыядычных выданняў сярод насельніцтва.

Пядаўна рэдакцыя атрымала адказ тав. Ігнатовіча аб выніках рэагавання на артыкул.

Замест таго, каб растлумачыць, чаму здарылася, што часопісы «Полымя» і «Вожык» не забіраліся са складаў Дзяржаўнага выдавецтва БССР для рознічнага продажу, Ігнатовіч пусціўся на агульныя разважанні, выпісаўшы цэлыя пункты з існуючага дагавора паміж «Саюздрукам» і Выдавецтвам па збыту літаратуры і газет; нічога канкрэтнага, што датычыць сутнасці справы, ён не сказаў.

Больш таго, тав. Ігнатовіч імкнецца абвергнуць факты. Ён піша: «Што датычыцца часопісаў, то, згодна існуючай умовы, для розніцы атрымоўваем 10 процантаў ад усяго тыража. Калі часопіс «Вожык» пры тыражу 15.000 экземпляраў нам неабходна было ўзяць 1.500 экземпляраў, то намі ўзята для розніцы № 11 гэтага часопіса 1550 экземпляраў. Тое-ж самае і з часопісам «Полымя».

Тое-ж самае, але не зусім. Калі звярнуцца да фактаў, то яны адразу адкрываюць нам вочы на ісціну. Замест таго, каб «Саюздрук» узяў 10 процантаў «Полымя» № 3, што складае 1000 экземпляраў, узята толькі... 450 экземпляраў, а № 1 гэтага часопіса ўзята 489 экземпляраў.

Аб чым гэта сведчыць? Перш за ўсё аб тым, што тав. Ігнатовіч не захацеў адкрыта прызнаць свае недахопы, асэнсаваць прычыны, якія садзейнічалі іх узнікненню.

І яшчэ больш здзіўляе прапанова начальніка рэспубліканскага аддзела «Саюздруку»: «Калі тыраж па падпісцы не асвоены, выдавецтва павінна друкаваць тыраж часопіса па **фактычнай наяўнасці падпісчыкаў** плюс 10 процантаў розніцы» А пасля заключае: «тады не будзе астаткаў на складзе Дзяржаўнага выдавецтва».

Замест таго, каб наладзіць шырокае распаўсюджанне выдаваемых часопісаў, кніг і газет, т. Ігнатовіч уносіць прапанову аб прыстасаванні работы Дзяржаўнага выдавецтва да дзейнасці «Саюздруку».

Кіраўніцтву рэспубліканскага аддзела «Саюздруку» варта, нарэшце, зразумець, што ўсё залежыць ад яго дзейнасці, ад яго работы. Розныя-ж апраўданні не могуць зняць той вялікай адказнасці, якая ўскладзена на «Саюздрук» і яго работнікаў.

ДЗЕ БЫЛА ПРЫНЦЫПОВАСЦЬ?

З пераходам тэатраў на бездатацыйную работу рэпертуарная лінія некаторых тэатраў пайшла на прыкметны ідэйны спад.

Наша газета адзначала пагоню за так званымі «касавымі», а па сутнасці безідэйнымі спяктаклямі, якія ўсё часцей і часцей пранікаюць на сцэну рэспубліканскіх і абласных тэатраў з маўклівага блаславення Кіраўніцтва па справах мастацтва.

І недаравальна тое, што ў гэтую незайздросную пагоню ўключыўся і адзін з старэйшых у рэспубліцы тэатр імя Янкі Купалы.

У апошні час афішы тэатра даволі часта стракацяць назвамі такіх спяктакляў, як «Сабака на сене», «Дура для іншых, разумная для сябе» і інш. З дзевяці спяктакляў, што ідуць зараз па сцэне тэатра, толькі тры па тэму сучаснасці. Пасля пастановы ЦК ВКП(б) аб рэпертуары тэатраў такую прапорцыю ніяк нельга ні зразумець, ні растлумачыць.

І ўжо зусім незразумелым стала з'яўленне на сцэне тэатра пустога, лёгкадумнага вадэвіля Р. Шэрыдана «Дзень цудоўных падманаў» («Дуэння») у пастаноўцы рэжысёра Л. Літвінава.

Совецкі тэатр не можа быць усеядным, калі справа датычыцца выбару пастановак з класічнай драматургіі. Не ўсё з драматургіі, тым больш заходне-еўрапейскай, варта совецкай сцэны. Тым не менш, кіраўніцтва тэатра сумесна з рэжысёрам агульнымі намаганнямі выцягнулі на сцэну «Дзень цудоўных падманаў».

Па працягу трох актаў на сцэне разыгрываецца любоўная блытаніна сявільскіх донаў і сеньярыт. Тры акты цалкам пайшлі на тое, што стары кавалер Жуліо Мяндоза выдае замуж сваю нявесту, а сам жэніцца на старой уродлівай служанцы. Па ўсім працягу спяктакля гледачу цяжка вырашыць — для чаго, уласна кажучы, яго запрасілі ў тэатр. Можа ў спяктаклі ёсць раскрыццё нейкіх грамадскіх суадносін тагачаснай Іспаніі? Не. Гэтая тэма ніяк не ўкладаецца ў любоўныя заляцанні маладых і старых сявільскіх лавеласаў. Можа спяктакль цікавы паказам тагачаснага быту і яго маралі? Але героі плашча і шпагі ніколі не былі носьбітамі характэрных адзнак быту і маралі свайго часу. Паколькі частка дзеі адбываецца ў манастыры, дык можа тэатр зрабіў спробу сатырычнага выкрыцця іспанскіх клерыкалаў? Таксама не, бо Шэрыдана нельга западозрыць у антыклерыкалізме, а калі ў п'есе і ёсць некаторыя элементы асмейвання клерыкальных асоб, дык занадта ўжо лагоднае, а тэатр зрабіў яго залішне гратэскавым.

Дык што-ж застаецца ад спяктакля для совецкага гледача, які прывык у класічных творах пазнаваць жыццё мінулых эпох? Нічога, акрамя заблытанай вадэвільнай інтрыгі, якая, трэба думаць, і спакусіла тэатр на пастаноўку гэтай п'есы.

«Дзень цудоўных падманаў»—спяктакль інтрыгі і дзеля інтрыгі. Выбар гэтай п'есы для пастаноўкі быў беспрынцыповым і дзяляцкім, калі яшчэ не казаць і аб пэўнай шкодзе для творчага каляктыва, занятага ў спяктаклі.

Акторам навязалі спяктакль, чужы іх творчай школе і традыцыям. П'еса ідзе пад рубрыкай музычнай камедыі, а ў рэжысёрскай трактоўцы яна ператварылася ў пародыю на апярэту. Цяжка апярэтачнаму актору іграць у драме, але яшчэ цяжэй драматычнаму актору іграць у апярэце, бо акрамя ўсяго яму трэба яшчэ ўмець спяваць і танцаваць. У гэтым спяктаклі актораў прымусілі і спяваць і танцаваць, што зусім не вымагалася ўсёй іх папярэдняй творчай працай у тэатры.

Цяжка пазбавіцца пачуцця няёмкасці за таленавітых і вядомых усім актораў, слухаючы іх «спевы» і гледзячы іх «танцы», пастаўленыя ў цыганска-іспанскім стылі, калі можна назваць стылем бездапаможную стылізацыю.

Элементарна вядомая ісціна, што для спеваў патрэбны голас, а для танца—пластычнасць, чамусьці засталася па-за ўвагай рэжысёра. І трэба не паважаць эстэтычны густ гледача, каб прапанаваць яму са сцэны тыя спевы і танцы, якімі шчодра нашпігаваны спяктакль. А для актораў такія вакальна-харэаграфічныя практыкаванні мяжуюць з прафесіянальнай кампраметацыяй.

Яшчэ большую няёмкасць выклікае імкненне рэжысёра пасмяшыць гледача, не грэбуючы сродкамі нават буфанаднай клаунады. Лопес, у выкананні заслужанага артыста Б. Янпольскага, гатовы качацца па падлозе, лазіць па слупах—абы смяяліся.

Сцэна з пераапрананнем Мяндозы ў манастыры так расцягнута, што адразу выдае тэндэнцыю рэжысёра выціснуць з яе ўсё для смеху.

Аб ігры актораў цяжка казаць што-небудзь добрае ці благое. Кожны з іх іграе па-свойму, але ўсе разам іграюць не тое, што им трэба.

Усё для смеху — пад такім дэвізам ідзе бадай увесь спяктакль, ясна даючы зразумець, што смех для пастаноўшчыка з'яўляецца асноўным крытэрыем мастацкага поспеху спяктакля.

Але там, дзе рэжысёр і акторы больш за ўсё вымагаюць смех, глядач праяўляе вельмі стрыманую рэакцыю і смяецца там, дзе смех вынікае арганічна.

Пагоня за смехам дзеля смеху — з'ява чыста фармалістычная і вельмі трывожная, бо яна ажыла на сцэне аднаго з перадавых тэатраў рэспублікі. Разам з тым, яна дае падставу меркаваць, што і выбар п'есы для пастаноўкі вынікаў з фармалістычнага разумення спяктакля, як чыста забаўляльнага відовішча. Ставячы гэты спяктакль, тэатр занядбаў свой асноўны закон—выхоўваць гледача, пашыраць яго светапогляд. Што можа выхоўваць, акрамя безгустоўнасці, вадэвіль Шэрыдана, чым ён узбагачае светапогляд совецкага гледача—цяжка сказаць.

Пастаноўка спяктакля «Дзень цудоўных падманаў» заняла ледзь не паўгода. І за гэты час можна было-б узбагаціць рэпертуар тэатра па меншай меры двума прэм'ерамі совецкіх п'ес.

Чаму такія совецкія п'есы, як «У адным горадзе»—Сафронава, «Стварэнне свету»—Пагодзіна, «Макар Дубрава», «Прыязджайце ў Званкавое» — Карнейчука і іншыя, што з поспехам ідуць зараз у сталічных і перыфярыйных тэатрах Саюза, не атрымалі ў тэатры імя Янкі Купалы прызнання, а другарадны вадэвіль Шэрыдана пусцілі на сцэну без чаргі?

Гэтае пытанне паўстае ў кожнага гледача пасля прагляду спяктакля «Дзень цудоўных падманаў» і патрабуе вычарпальнага адказу.

Р. ШКРАБА

ВАЧЫМА СОВЕЦКАГА ЧАЛАВЕКА

Совецкі чалавек за мяжой — гэтая тэма не аднойчы прыцягвала ўвагу нашых пісьменнікаў. Дастаткова прыгадаць выдатныя вершы аб замяжы Уладзіміра Маякоўскага, у якіх ён уславіў совецкага чалавека, яго гордасць сваім дзяржаўным ладам, дасягненнямі сваёй краіны, яе навукай, культурай, мастацтвам. «У советских собственная гордость» — гэтыя радкі паэта, якія зрабіліся крылатымі, вельмі добра перадаюць тыя пачуцці, якія натхнялі паэта, якія хвалююць чытача, калі ён чытае і перачытвае яго вершы.

Некалі Н. В. Гогаль марыў аб тым часе, калі ў Расію будуць прыязджаць па мудрасць. Цяпер у совецкай краіне рэчаіснасць не толькі сцвердзіла прадбачанні вялікага пісьменніка, але і невымерна апярэдзіла іх. Сапраўдная навука і культура, якая ўжо ў часы Н. В. Гогаля пачала знікаць з еўрапейскіх рынкаў, цяпер у буржуазных краінах ператварылася ў пакорную прыслужніцу капітала. Махляры Уол-стрыта і літаратуру, і мастацтва імкнуцца ператварыць са сродка прагрэса і цывілізацыі ў сродак прыніжэння чалавека, знішчэння яго надзей на будучыню, у сродак запалохвання чалавецтва неадхільнасцю новай атамнай вайны.

Перадавыя вучоныя, пісьменнікі, дзеячы мастацтва не толькі адмежаваліся ад гэтай згубнай палітыкі новых падпальшчыкаў вайны, але і на справе засведчылі сваю рашучасць весці барацьбу з рэакцыяй. Сусветны кангрэс дзеячоў культуры, які адбыўся ў жніўні г. г. у Вроцлаве, паказаў згуртаванасць прагрэсіўнага чалавецтва ў барацьбе з ідэалагічнай экспансіяй амерыканскага імперыялізма. Совецкая краіна была, ёсць і будзе для ўсяго чалавецтва велічным маяком, які паказвае шлях у будучыню. Сусветна вядомыя дасягненні совецкай навукі, сапраўдны росквіт літаратуры і мастацтва ўмацоўваюць упэўненасць перадавых людзей за мяжой ва ўрачыстасці прагрэса і цывілізацыі над цёмнымі сіламі рэакцыі. На прыкладзе Совецкага Саюза яны справядліва бачаць узор краіны, за якой трэба ісці, якую трэба пераймаць. Вельмі добра сказаў аб натхняльным прыкладзе краіны Советаў для іншых народаў чэшскі пісьменнік-комуніст Юліус Фучык, назваўшы яе краінай, «дзе заўтра ўжо азначае ўчора».

Перад совецкімі пісьменнікамі стаяць вялікія задачы па прапагандзе ідэй комунізма, у выкрыцці антычалавечай, нікчэмнай маралі імперыялізма. Кожны новы твор, які служыць гэтым высокародным мэтам, сустракаецца з вялікай цікавасцю не толькі ў нас, але і за мяжой. Поўная гнеўнага пратэсту совецкага чалавека супроць занявольнікаў індыйскага народа, удастоеная Сталінскай прэміі «Індыйская балада» таджыкскага паэта Мірзо Турсун-Задэ з захапленнем была сустрэта ў Індыі. Амаль усе індыйскія газеты і часопісы надрукавалі ўрыўкі з гэтага пафаснага твора, прасякнутага пачуццём дзейснага совецкага гуманізма.

Нядаўна ўкраінскі паэт Мікола Бажан у часопісу «Вітчизна» надрукаваў цыкл вершаў аб замяжы — «Англійскія ўражанні». Высакародны пафас, усхваляванасць, глыбокія жыццёвыя абагульненні ў спалучэнні з высокім паэтычным майстэрствам робяць гэтыя вершы сапраўднымі творамі совецкай літаратуры, якая заклікана не толькі адлюстроўваць жыццё, але і ўплываць на яго.

Цыкл вершаў «Англійскія ўражанні» напісаны паэтам пад уражаннем наведання ім разам з совецкай дэлегацыяй у мінулым годзе Англіі. Аднак, вершы М. Бажана — гэта не проста ўражанні экскурсанта або падарожніка. Паэт глядзеў на свет вачыма совецкага чалавека, які не можа быць абыякавым да ўсяго таго, што ён бачыць. Ён шчыра радуецца, калі гутарка ідзе аб дасягненнях народаў іншых краін, ён абураецца і пратэстуе, калі бачыць прошукі падпальшчыкаў новай вайны. Паэт з гордасцю гаворыць аб невымерна вялікім укладзе совецкіх народаў у справу разгрома фашызма і ўмацавання міру. Ён рады паведаць суайчыннікам вялікага Шакспіра, што яго творы па-сапраўднаму цэняцца ў Совецкай краіне. Узнёсла і велічна апавядае паэт пра слаўныя старонкі ў гісторыі большэвіцкай партыі, адной з выдатных вех якой з'яўляецца V лонданскі з'езд.

Вершы М. Бажана прасякнуты радасным пачуццём нацыянальнай гордасці совецкіх людзей, усведамленнем іх вялікіх заслуг перад народамі ўсяго свету.

Сляды вайны, якія засталіся «на скалах Дувру і на пяску Кале», нагадалі паэту пра вялікую небяспеку, якая навісла ў тыя дні над Англіяй. У дакладных і выразных строфах М. Бажан малюе карціны жорсткіх баёў.

Кріз млу туманів, бур і снігопадів
Над морем йшлі у стемнені міста
Товсті й гучні параболи снарядів,
Мов арки смертоносного моста.

І багровіла раптом хвиля сиза
Коли гримів в розпадинах горбів
Тяжкий стрибок німецького заліза
І виростав, як чорний дуб, розрив.

Гэты малюнак заключаны ў вершы абагульняючымі строфамі аб тым, што ратныя і працоўныя подзвігі совецкіх людзей зрабілі немагчымым для нямецкіх разбойнікаў, чэмпіёнаў смерці, пераплысці вузкі Ла-Манш, таму што «Волги він не змог переступити».

І не бетонні доти низьколобі,
Не гострі ребра ржавих іжаків
І навіть не чорномундирний Боббі
Війну перед каналом зупинив.

На інших землях вирішалась доля
Цих хвиль тісних, цих пагорбів блідих...
Полин степів, курган доньского поля
І вользких вод широкошумний біг!

Дакладны адрас мае верш пра англійскага кансерватара, майстра хлусні і правакацыі. Чытач беспамылкова ўгадвае ў гэтым шаржыраваным вобразе падпальшчыка новай вайны, чалавека са сківіцамі бульдога.

Червоно-жовту і масну, як сир,
Він голову підкидує відразу
Шось зжовує, неначе слинить фразу,
Якою знов хотів би плюнуть в мир.

У бяссільнай злосці да совецкага народа, якая ўжо трыццаць год трасе незадачлівага палітыка, ён згубіў усялякі чалавечы воблік. Але

Ніщо не помогло, ні сотні змов і
здрад,
Ні хітрість шпигунів, ні ватіканьска
меса.
Не крутяться назад історії колеса,
Хоч лізь під них, не крутяться назад.

Баявы, надзённы характар мае верш «Біг Бен», у якім паэт развенчвае англійскі парламент, ператвораны Уол-стрытам у свой орган у сорак дзевятым штаце. Біг Бен, або вялікі доўгі Бен — так называецца вежа з гадзіннікам ля будынка парламента ў Лондане. Каменны грэнадзер, вылеплены на вежы, многа чуў парламенцкіх спрэчак на сваім вяку. Але ён упершыню чуе прамовы, якія гучаць пад дыктоўку янкі. Ён вельмі здзіўлены паводзінамі парламенцкіх дзеячоў, якія

На все що ім велить Нью-Йорк
Казали б лиш: «О'кей!»

Але маўклівы вартавы народных традыцый, стары вусаты грэнадзер, упэўнены ў краху гэтай антынароднай палітыкі.

Хоча й привабив цих людей
Заморський джентельмен,
Та наш народ не зрік: «О'кей!»
О ні — говорить Бен.

Пад уражаннем наведання радзімы карыфея сусветнай драматургіі Вільяма Шакспіра напісаны верш «У Стратфордзе на Эйвоне». З маўклівай павагай перад веліччу бяссмертнага генія прышоў паэт

Туди, де, поважно підвівшись у ніші,
Він піше крилатим пером.

Геніяльны драматург не памыліўся — гаворыць паэт — калі на плітах сваёй магілы прасіў напісаць словы эпітафіі, поўныя трывогі за прах невяльможных нябожчыкаў. Англійскім імперыялістам — гандлярам сумленнем і нацыянальнымі традыцыямі — няма справы да народных святынь. «Лебедзь Эйвону» (так у Англіі называюць Шакспіра) замоўк у сябе на радзіме.

У совецкага чалавека пачуццё нацыянальнай гордасці спалучаецца з павагай да культуры другіх народаў. Паэт горды ад усведамлення, што ў Совецкім Саюзе вялікі драматург знайшоў сваю другую, сапраўдную радзіму.

Далеко звідсіль, на горістому Сході,
Де мриють Памірські шпилі,
Долаючи прірви й річки бистроводі,—
Таджик прикіпів на сідлі, —
В свистючих метілях, в гудучій негоді
До міста він мчить звіддалі,
Щоб в місто над вечер прибути й
почути
Замислене «Буть чи не бути?»

Апошні па ліку з пакуль надрукаваных вершаў цыкла «Англійскія ўражанні»— «У адным з лонданскіх кварталаў» прысвечаны гістарычнай падзеі ў жыцці і барацьбе большэвіцкай партыі — V лонданскаму з'езду РСДРП. Верш гучыць велічна і ўрачыста, як гімн слаўнай партыі. Кідаючы погляд у мінулае, паэт бачыць у сённешніх справах плён вялікіх ідэй Леніна і Сталіна, якія ў тыя дні згуртоўвалі і гартавалі партыю на барацьбу з царызмам, вялі рабочы клас да перамогі.

Так партія міцніла і зростала,
Готуючи той час, той жданий день
сигнала,
Що у бурі й громі йде дев'ятий гнівний
вал, —
І через десять літ пророкотав сигнал.
І той, що йшов колись по лондонському
бруку,
В квітневий вечер через десять літ
На панцерник зійде, й зведе пророчу
руку
Вказати світові, куди ітіме світ.
І добрый друг його — мислітель, вождь
і воїн
Зведеться поруч з ним, і так підуть
вони
Вперед, у боротьбу, в труды доби
нової,
В літа работи, творчості й войни.

Вершы М. Бажана аб замяжы з'яўляюцца вартым прадаўжэннем традыцый лепшага, таленавіцейшага паэта совецкай эпохі Уладзіміра Маякоўскага. Публіцыстычна завостраныя, адзначаныя адной з важнейшых якасцяў совецкай літаратуры—пачуццём часу,—яны служаць высакародным мэтам услаўлення совецкага чалавека.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.

Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА (КРЫСЬКО)—нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

АТ 02331 Друкарня «Чырвоны Друкар» Рэволюцыйная, 12. Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 34 Тэлефоны: галоўнага рэдактара 2-31-94, сакратарыята 2-32-84